№ 8 (606) 25 лютага 2009

www.nn.by

незалежная газета

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Заснаваная ў лістападзе1906. Адноўленая ў траўні 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у серады

## Небяспечныя сувязі братоў Касціцыных

Старонка 6

## Адам Глобус: Колькі можна жраць?

Старонка 7



## Гісторыя: Радзівіл Пане Каханку

Старонка 11




### У НУМАРЫ

**Рэальны стан нашай эканомікі**

Са статыстыкі самога Белстату вынікае, што ВУП у студзені не толькі не вырас на 4%, але знізіўся прыкладна на 5%. Піша эканаміст Аляксандр Чубрык. **Старонка 2.**

**Самая дарагая кватэра ў Беларусі**

прададзеная ў Драздах. **Старонка 8.**

**У Мінску ліквідаваная падпольная порнастудыя**

з відам на галоўны праспект горада. **Старонка 8.**

**Абменнік у «Прасторы» абчысцілі, як у кіно**

Рабаўнік скраў 80 тыс. даляраў, выдаўшы сябе за інкасатара, а пасля ўжыўшы супраць касіркі электрашокер. **Старонка 8.**

**Нямецкая рака Нёман**

Кніжка пра Беларусь для нямецкага турыста. **Старонка 12.**

**Праграма «Белсату»**

На 2—8 сакавіка. **Старонка 15.**


«Наша Ніва» з'яўляецца ў кіёсках у Мінску ў сераду ад абеду, у рэгіёнах — у чацвер. На газету можна і падпісацца — **старонка 2.**

# Працэс пайшоў

На мінулым тыдні на Мінск абрынуўся цэлы дэсант еўрапейскіх візіцёраў. **Старонка 3.**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

# Абвал заробкаў

**Белстат: сярэдняя налічаная зарплата (бруднымі) скарацілася з 1000,2 тыс. руб. у снежні да 919,6 руб. у студзені. Калі браць у далярах — з 450 даляраў да 330 даляраў.**

У Беларусі намінальная налічаная сярэдняя зарплата работнікаў у студзені 2009 года склала 919,6 тыс. рублёў, паменшаўшы проці студзеня 2008 г. на 8,1% (80,6 тыс. руб.), паведаміў Белстат.

Рэальная ж зарплата (разлічаная са скідкай на рост спажывецкіх цэнаў) зменшылася ўвогуле на двухзначную лічбу.

Самай высокай застаецца зарплата ў будаўніцтве (дзе працоўная сіла найбольш мабільная, а паслугі працоўнай сілы запатрабаваныя і ў суседніх краінах), фінансавым сектары і ў выкладчыкаў ВНУ. Самай нізкай — у сельскай гаспадарцы і сферы дашкольнай і сярэдняй адукацыі, працаўнікі якіх цалкам залежныя ад дзяржавы.

Падзенне заробкаў у нацыянальнай валюце і яе даляравым эквіваленце ў Беларусі сувымернае з падзеннем іх у Расіі і Украіне.

**МБ**

### «Жаўнеры БНР» у Горадні і Баранавічах

Прэзентацыя новае кнігі выдатнага сучаснага гісторыка, праф. Алега Латышонка «Жаўнеры БНР» пройдзе з удзелам аўтара. Кніга — гэта вычарпальны збор працаў, прысвечаных незалежніцкім вайсковым фармаванням 1917—1924 гадоў.

**1 сакавіка — Баранавічы, вул.Міцкевіча, 65.**

**5 сакавіка — Горадня, зала Таварыства беларускай школы, вул.Будзённага, 18.30.**

Даведкі па тэл. (8–029) 550–79–69.

# Рэальны стан нашай эканомікі

**Са статыстыкі самога Белстату вынікае, што ВУП у студзені не толькі не вырас на 4%, але знізіўся прыкладна на 5%. Піша эканаміст Аляксандр Чубрык.**

Белстат абвясціў, што ў студзені валавы ўнутраны прадукт беларускай гаспадаркі працягваў расці (на 4,2%) назло ўсім стыхіям і насуперак таму, што ВУП большасці краінаў Еўропы знізіўся або замёр. Якім чынам дасягнуты такі цуд?

Асноўным складнікам поспеху заяўляецца фантастычны рост інвестыцыяў у асноўны капітал беларускіх прадпрыемстваў — згодна з Белстатам, ён склаў аж 24,9%. Гэта значыць, прадпрыемствы працягвалі ўдарнымі тэмпамі закупляць новыя вытворчыя лініі, аўтамабілі і будынкі. Не будзем пра тое, што студзеньскія інвестыцыі рабіліся за снежаньскія бюджэтныя грошы, шчодра выдаткаваныя ўрадам пры канцы бюджэтнага года (то бок у снежні й першай палове студзеня).

Другім складнікам быў рост рознічнага тавараабароту на 17%, афіцыйна патлумачаны паслядэвальвацыйным ажыятажам.

Аднак нават з улікам гэтых двух фактараў аб'ём ВУП у студзені 2008 года склаў у бягучых цэнах толькі 9,07 трыльёна рублёў, тады як у студзені 2009 года ён складаў 7,9 трлн рублёў.

Чаму мы кажам «толькі 9,07»? Бо, як пазначае Белстат, гэта лічба, змераная «ў бягучых цэнах». А рост ВУП заўжды разлічваецца не ў бягучых, а ў супастаўных цэнах, з пералікам праз дэфлятар. Кожны чалавек разумее, што 1 рубель у студзені 2009 каштаваў меней, чым у студзені 2008, што за яго меней можна было купіць, ён быў умоўным эквівалентам меншае вартасці.

Колькі ж складаў дэфлятар у студзені? Калі мы складзем прапорцыю з вядомых нам лічбаў — 9,07 трлн, 7,9 трлн і 4,2% заяўленага росту ВУП, выходзіць што дэфлятар ВУП, паводле афіцыйных дадзеных, склаў 10,1%.

Аднак, паводле падлікаў таго самага Белстату, дэфлятар за 2008 год складаў 20,6%, з іх за 4-ы квартал 2008 года — 20,2%. Якім жа чынам дэфлятар мог так рэзка знізіцца ў студзені, калі, як мы ведаем, кан'юнктура рынкаў у снежні і студзені так мала рознілася, а інфляцыя, наадварот, узрасла?

Дарэчы тут будзе патлумачыць, што азначае эканамічны тэрмін «дэфлятар». Гэта індэкс сярэдняга росту цэнаў у кошыку, які ўключае ў сябе не толькі спажывецкія, крамныя цэны, але і цэны прамысловых вытворцаў, цэны будаўнічых паслуг і г.д.

Дык вось, усе індэксы росту цэнаў, якія заўжды рухаліся ў адным кірунку з дэфлятарам, або выраслі ў студзені проці 4-га кварталу, або засталіся прыкладна на тых жа ўзроўнях. Вырас індэкс росту спажывецкіх цэнаў (у студзені ён быў на 0,4% працэнтавыя пункты вышэйшы, чым у 4-м квартале, — 15% супраць 14,6). Вырас індэкс росту цэнаў прамысловых вытворцаў (у 4-м квартале ён быў 18%, у студзені стаў 19,9).

Такім, чынам, можна зрабіць выснову, што індэкс-дэфлятар ВУП у студзені таксама павінен быў падрасці з 20,2%, якія ён складаў у 4-м квартале, да прыкладна 20,5—21%. Вядома, гэта не можа разглядацца як дакладная лічба, але проста як альтэрнатыўная ацэнка, якая вынікае з кірунку, у якім рухаліся астатнія індэксы цэнаў. Дакладнай лічбы не ведае нават Белстат — бо ВУП разлічваецца на падставе інфармацыі, якая збіраецца ад шматлікіх упраўленняў гэтай арганізацыі, на ўзроўні якіх і адбыўся «збой».

Заяўлены Белстатам рост 4,2% выходзіць, толькі калі прыняць студзеньскі дэфлятар меншым прыкладна ўдвая за той паказчык, які атрымаўся ў нас на падставе дынамікі іншых індэксаў, альбо, працей кажучы, калі цэлае ўдвая меншае за суму частак.

А пры пераліку праз рэалістычны дэфлятар выходзіць, што ВУП Беларусі ў студзені знізіўся прыкладна на 5%. Статыстычная «памылка» сягае амаль 10 адсоткавых пунктаў! А памылковыя статыстычныя звесткі здольныя паўплываць на прыняцце эканамічных рашэнняў, увесці ў зман і выклікаць страты.

Што азначае падзенне ВУП на 5%?

Па-першае, гэта ставіць Беларусь у адзін шэраг з праблемнымі краінамі Еўропы. Крызіс зачапіў Беларусь больш, чым Расію, Польшчу ці Літву. У большай ступені, чым наша краіна, закранутыя пасярод усіх сарака еўрапейскіх дзяржаваў толькі Латвія, Украіна, Венгрыя і Ісландыя. І сапраўды, толькі гэтым краінам і нашай Беларусі спатрэбілася тэрміновая дапамога МВФ.

Па-другое, такі значны тэмп скурчвання гаспадаркі з вялікай імавернасцю прывядзе да патрэбы далейшага змяншэння бюджэтных расходаў і новай дэвальвацыі рубля. Такія варыянты варта прадугледжваць пры планаванні сямейных выдаткаў і бізнэсу.

**Аляксандр Чубрык**

эканаміст Інстытута прыватызацыі і мэнэджмэнту

## СЦІСЛА

### Лукашэнка: Жыллё канфіскуем і прададзім

А.Лукашэнка паставіў задачу да канца першага кварталу 2009 г. рэалізаваць усё пабудаванае камерцыйнае жыллё. «Калі бізнэсоўцы не рэалізуюць, мы яго канфіскуем і прададзім тым, каму яно трэба, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — І няхай радуюцца, калі мы ім заплацім па сабекошце». Гэтае жыллё павінна быць прададзена блізка да сабекошту, падкрэсліў ён.

### Астэроід Апофіс можа сутыкнуцца з Зямлёй

Астэроід Апофіс можа апынуцца ў небяспечным для Зямлі суседстве: у 2029 г. ён, паводле папярэдніх разлікаў, падыдзе на адлегласць, у дзесяць разоў бліжэйшую за Месяц, лічаць у абсерваторыі Расійскай Акадэміі Навук. Дакладна разлічыць арбіту шасцісотметровай глыбы можна будзе толькі ў 2012 г.

### Не таго Глеба купілі?

Як паведамляе сайт кітайскага футбольнага клуба «Шанхай Шэньхуа», заробак нападаючага зборнай Беларусі Вячаслава Глеба складзе два мільёны еўра за два гады супрацоўніцтва з камандай. Для прыкладу: заробак у зорнага брата Вячаслава Аляксандра Глеба ў «Барселоне» складае 4 мільёны еўра ў год. Мо кітайцы не таго Глеба купілі?

**ЗП**


# Не ўсё ў жыцці апошні раз

## Падпісацца можна праз Рэдакцыю і праз «Белпошту». Мы рэкамендуем — праз Рэдакцыю

Мы рэкамендуем і просім чытачоў падпісвацца праз Рэдакцыю. Наша сістэма дастаўкі газеты за 3 гады даказала сваю надзейнасць. Усе тыя, каго такі спосаб атрымання газеты задавальняе, хай застаюцца вернымі такой падпісцы.

1. Яна нам выгаднейшая фінансава.

2. Мы зможам дастаўляць Вам газету хутчэй або з той жа хуткасцю, што «Белпошта».

3. Лічым важным захаваць сістэму самараспаўсюду дзейнай. Лішне тлумачыць, чаму.

Цана падпіскі праз Рэдакцыю **10 000 руб. на месяц**.

Падпісныя індэксы ў каталогу «Белпошты»: для людзей — **63125**, для прадпрыемстваў — **631252**. Падпісацца можна на кожнай пошце. Цана гэтай падпіскі — 12 000 руб. на месяц.

ПАВЕДАМЛЕННЕ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828

МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764

Рахунак атрымальніка: 3012 206 280 014 | Асабовы рахунак:

(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газету "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |

Агулам

Касір

КВІТАНЦЫЯ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828

МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764

Рахунак атрымальніка: 3012 206 280 014 | Асабовы рахунак:

(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газету "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |

Агулам

Касір М.П.

**Каб штотыдзень атрымліваць газету,**

дасылайце адрасы і грошы за газету. Кошт на месяц — 10 тыс. рублёў.

1) Просім усіх ахвотных чытаць газету **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Мінск, а/с 537.

2) **Просім у бланку банкаўскага паведамлення ці паштовага перакзу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езду.**


Тры гады «НН» можна было атрымаць толькі падпісаўшыся праз Рэдакцыю. І мы завялі традыцыю дзякаваць усім тым чытачам, якія пералічваюць грошы на выхад газеты.

### Дзякуй

**Святаславу Г., Валянціне А.** з Талачынскага раёну.
**С.Б.** з Астравецкага раёну.
**Аксане Л.** з Пінску.
**І.Д.** з Мядзельскага раёну.
**А.З., Івану Л.** з Пружанскага раёну.
**Сержуку Р.** з Бярозаўскага раёну.
**Івану З., А.Т., В.М., Тамары К., С.К., Марыне Я., Ірыне З., Аляксандру Ш., Ірыне З., А.П.** з Смалявіцкага раёну.
**Іне С., Уладзіміру Д., Галіне Г., А.Ж.** з Барысаўскага раёну.
**А.С., Фёдару Г., Наталлі П., Юр'ю К.** з Мазырскага раёну.
**І.Ф.** з Брэсцкага раёну.

# Працэс пайшоў

На мінулым тыдні на Мінск абрынуўся цэлы дэсант еўрапейскіх візіцёраў.



**Цёпла сустракалі дэлегацыю Рады Еўропы чыноўнікі МЗС (з левага боку фота).**

ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Спачатку ў Беларусь прыехала дэлегацыя ПАСЕ на чале са старшынём камісіі па палітычных пытаннях Ёранам Ліндбладам. Потым завітаў прадстаўнік Еўрасаюзу па пытаннях супольнай замежнай палітыкі і палітыкі бяспекі Хаўер Салана. Ну і пры канцы тыдня ў сталіцы была неафіцыйная дэлегацыя Еўрапарламенту.

Найбольш важным быў, безумоўна, прыезд Хаўера Саланы. Упершыню за часамі Лукашэнкі Беларусь наведаў такі высокі чыноўнік з Еўрасаюзу. Салана быў у Мінску паўдня і паспеў сустрэцца з прадстаўнікамі незалежнага грамадства, міністрам замежных справаў Сяргеем Мартынавым, Аляксандрам Лукашэнкам, а таксама з журналістамі.

«У Брусэлі вераць, што Беларусь стане ўдзельнікам праграмы «Усходняе партнёрства». І гэта вельмі вялікі шанец для нашай краіны. Салана сказаў: вы хочаце лепшага для сваёй краіны, і мы таксама хочам ёй таго ж», — адзначыў пасля сустрэчы з Саланам лідэр Руху за Свабоду Аляксандр Мілінкевіч.

«Я б вельмі папрасіў, каб у стасунках паміж Беларуссю і Еўрасаюзам мы пастараліся выключыць усякіх пасярэднікаў, асабліва тых, хто непрыязна ставіцца да нашай краіны. Я маю на ўвазе пасярэднікаў як унутры краіны, так і за яе межамі, а іх шмат», — заявіў Аляксандр Лукашэнка, яўна намякаючы на апазіцыю.

За пару дзён да гэтага ў Магілёве Лукашэнка пра апазіцыю выказваўся куды больш жорстка: «Яны на мяне цэлую цялегу напісалі, яна ляжыць у мяне на стале. І Чэхія сёння пачынае фармаваць парадак дня, сыходзячы з іх патрабаванняў».

Былі і адкрытыя кампліменты з боку Лукашэнкі на адрас Саланы, якімі ён звычайна абсыпае сяброў тыпу Чавэса: «Без вас не было б таго пацяплення, якое адбываецца цяпер».

Ужо па сустрэчы з Лукашэнкам Салана заявіў журналістам: «Я не прыехаў сюды з нейкімі ўмовамі. Еўрасаюз умее выбудоўваць стасункі з іншымі краінамі без умоваў. Наша сустрэча была вельмі канструктыўнай і добразычлівай. Я хацеў бы выказаць спадзяванне, што гэты працэс дыялогу будзе працягвацца. У ліку прыярытэтаў ЕС — праца над праграмай Усходняга партнёрства. З майго меркавання, вашай краіне ёсць месца ў гэтай праграме», — сказаў Х.Салана.



**К нам прыехаў, к нам прыехаў Андрэа Рыгоні дарагі.**

ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Потым еўрачыноўнік правёў невялікую прэс-канферэнцыю для пяці незалежных журналістаў у гатэлі «Краўн Плаза». Сярод пяці быў і карэспандэнт «Нашай Нівы».

Якое ўражанне ад Аляксандра Лукашэнкі? — найперш спыталася яго Святлана Калінкіна, шэф-рэдактарка «Народнай волі».

Гэта першы раз. Доўгая сустрэча, вельмі канструктыўная, адказаў ён. Я задаволены вынікамі. Думаю, Беларусь хоча далучыцца да Усходняга партнёрства і ўсё гатова да таго. Рашэнне прыехаць і гаварыць адкрыта з прэзідэнтам было вельмі ўдалае.

Чаму Салана прыехаў менавіта цяпер?

Усе хацелі шчыльнейшых стасункаў між ЕС і Беларуссю, адказаў ён. Гэта працэс, які, я спадзяюся, рухаецца ў правільным кірунку. Я задаволены тым, што працэс ёсць.

Ці будзе наступным крокам візіт Лукашэнкі ў Прагу?

Гэта вырашаю не я, а чэшскае старшынства [у ЕС краіны старшынствуюць па чарзе — Рэд.], ухіліўся ад адказу Салана. Стасункі з краінамі ЕС развіваюцца, і дынаміка канструктыўная. Працэс ідзе, каб вырашаць такія праблемы.

А як жа новыя праблемы з правамі чалавека, разгон 14 лютага, Аўтуховіч?

Усё, што трэ было сказаць, я сказаў, запэўніў Салана. Усё, што трэ было крытыкаваць, я крытыкаваў. Вынік пасля ўсяго гэтага канструктыўны.

І якія ж менавіта цяжкія праблемы абмяркоўвалі? — удакладнілі мы.

Не хачу раскрываць прыватных дэталяў. Не магу сказаць іншага, акрамя: гэта быў канструктыўны візіт, і важнай будзе сустрэча, што адбудзецца ў сакавіку [у Беларусь мае прыехаць іншы камісар — Бэніта Фэрэра-Вальднэр, адказная за пашырэнне ЕС і супрацу з суседзямі. — Рэд.] Будзем зважаць на парадак дня, у тым ліку на правы чалавека.

Чым тлумачыце паварот у стаўленні Беларусі да ЕС?

Не мая справа тлумачыць, засмяяўся дыпламат. Я проста задаволены, бо аказалася, што няма нічога несумяшчальнага. Можнаадначасова глядзець і на ўсход, і на захад. Гэта не тая гульня, у якой калі адзін выйграе, другі канечне прайграе. Усе могуць выйграць.

Лукашэнка адзначыў учора ў Магілёве, на малаказаводзе, што не пацерпіць ніякіх пасярэднікаў у дыялогу ЕС — Беларусь, маючы на ўвазе апазіцыю. Што Вы пра тое думаеце? — спытаўся карэспандэнт «НН».

А я па-іншаму інтэрпрэтую гэтыя словы, як і тое, што ён сказаў па выніках сустрэчы, заіскрыўся сваёй непаўторнай усмешкай ветэран еўрапейскай дыпламатыі. Мы хочам непасрэдных стасункаў на міжнародным узроўні.

Расчараваны тым, што Салана амаль не закрануў пытанне правоў чалавека, свабоды СМІ, каардынатар «Хартыі-97» Андрэй Саннікаў напісаў: «Лукашэнка як падманваў Еўропу сваімі пустымі абяцанкамі, так і будзе працягваць гэта рабіць. Салана прыехаў для сустрэчы з Лукашэнкам і для заключэння з існуючым рэжымам пэўных дамоўленасцяў. Яны накіраваныя на выбудоўванне стасункаў афіцыйнага Мінска з еўрапейскімі бізнэсоўцаў».

Па-ранейшаму невядома, пра што ж гаварылі падчас сустрэчы сам-насам Лукашэнка і Салана. Як паведамляе радыё «Свабода» са спасылкай на агенцтва Reuters, Хаўер Салана нібыта прыязджаў да Лукашэнкі, каб давесці, што адной з умоваў яго запрашэння ў Прагу на саміт Усходняга партнёрства з'яўляецца непрызнанне Беларуссю незалежнасці Абхазіі і Паўднёвай Асеціі.

Напэўна, візіт Саланы з'яўляецца знакам таго, што Еўрасаюз гатовы да нармалізацыі стасункаў з афіцыйным Мінскам нават нягледзячы на парушэнні правоў чалавека (ніякіх заяваў наконт арыштаў Мікалая Аўтуховіча і Арцёма Дубскага з боку ЕС яшчэ не было).

Разам з тым, цяжка меркаваць, наколькі ўвогуле арыентуюцца ў беларускай сітуацыі брусэльскія чыноўнікі. Можна смела гаварыць, што ў прарыве на беларускім фронце зацікаўленая літоўская, польская дыпламатыя, але Лукашэнка хоча весці перамовы непасрэдна з прадстаўнікамі Еўрасаюзу, таму ў Мінск і прыязджае Салана.

Цікавая акалічнасць, што на сустрэчу з Саланам не быў запрошаны ніхто з прадстаўнікоў Аб'яднаных Дэмакратычных Сілаў. Разам з тым, адзінай умовай, якую высоўвае ПАРЕ для аднаўлення для Беларусі статусу спецыяльна запрошанага, — гэта ўдзел у дэлегацыі прадстаўнікоў апазіцыі.

«Няма ніводнай краіны, дзе ў парламенце не прысутнічае апазіцыя. Хіба што Кітай, нават у Іране яна ёсць. Не паверу, што ніводзін апазіцыянер не мог трапіць у беларускі парламент. Канечне, у склад дэлегацый членаў ПАРЕ ўваходзяць толькі парламентары, але ў Беларусі спецыяльны статус, таму і патрабаванні будуць спецыяльныя», — сказаў у Мінску Ё.Ліндблад. Гэта можна разглядаць як кампенсацыю за тое, што апазіцыю адсунулі ў перамовах між Мінскам і Брусэлем.

23 лютага расійскае агенцтва РИА «Новости» распаўсюдзіла навіну, што Еўрапейскі саюз афіцыйна ўключыў Беларусь у праграму «Усходняе партнёрства». А рашэнне было прынятае кіраўнікамі ўсіх 27 краін — сяброў ЕС.

На наступны ж дзень высветлілася, што навіна заўчасная. Чэшскае прадстаўніцтва абвергла інфармацыю, што Беларусь ужо ўключаная ў праграму Усходняга партнёрства. Канчатковае ж рашэнне, найхутчэй, будзе прынятае ў красавіку.

**Мікола Бугай,**
**Зміцер Панкавец**

## АНЕКДОТ АД СІЛІЦКАГА

У Мінску распачаўся працэс па справе незарэгістраванай арганізацыі «Усходняе партнёрства».



**Перад сустрэчай з Лукашэнкам Салана гадзіну размаўляў з апазіцыяй. На фота злева направа: дарадца Саланы, фін Пірка Тап'ёла, Салана, Казулін і кіраўніца прафсаюзу незалежных журналістаў Жанна Літвіна.**

ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

# Ад сямі да дванаццаці гадоў

**Ваўкавысцу Мікалаю Аўтуховічу 18 лютага было высунутае афіцыйнае абвінавачанне, паведаміў «НН» адвакат Павел Сапелка.**


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Прадпрымальніка абвінавачваюць у парушэнні часткі 3 артыкулу 218 КК («Наўмыснае знішчэнне ці пашкоджанне маёмасці, здзейсненыя арганізаванай групай, якія прывялі да шкоды ў асабліва буйным памеры»). Санкцыя паводле артыкулу складае ад 7 да 12 гадоў.

Юрыю Лявонаву і Уладзіміру Асіпенку прад’яўленае больш мяккае абвінавачанне – артыкул 218, частка 2 КК: «Наўмыснае знішчэнне альбо пашкоджанне маёмасці, якое прывяло да значных стратаў». Паводле гэтага артыкулу мужчынам пагражае ад 3 да 10 гадоў зняволення.

17 лютага пра арышты прадпрымальнікаў выказаўся Лукашэнка, які заявіў, што не дапусціць у краіне тэрарызму і экстрэмізму. «У нас закон адзін. Законная зброя — захоўвай, незаконная — выбачай. Аўтаматы, гранаты прыватніку захоўваць нельга», — сказаў у Магілёве кіраўнік дзяржавы.

Акцыі салідарнасці з Аўтуховічам, Лявонавым і Асіпенкам праходзяць у Мінску і іншых гарадах Беларусі і замежжа.

Тым часам стала вядома, што судовы працэс над кіраўніком асіповіцкай філіі «Маладога фронту» Арцёмам Дубскім прызначаны на 3 сакавіка. Паседжанне адбудзецца ў Асіповіцкім гарадскім судзе.

Яго абвінавачваюць у парушэнні ўмоваў адбыцця пакарання за «Працэс чатырнаццаці». Юнак можа атрымаць ад шасці месяцаў да трох гадоў турмы. Артуру Фінькевічу па гэтым артыкуле ў снежні 2007 далі паўтара года калоніі.

**Зміцер Панкавец**

# Турмы пустымі не бываюць

**Яшчэ адзін ўдзельнік «Працэсу чатырнаццаці» апынуўся ў турме. Следам за Арцёмам Дубскім у ізалятар змясцілі непаўналетняга Максіма Дашука.**



23 лютага яго выклікалі ў РУУС Маскоўскага раёну сталіцы, дзе прад’явілі абвінавачанне ў парушэнні ўмоваў адбыцця пакарання і змясцілі на Акрэсціна. 24 лютага пракурор змяніў М.Дашуку меру ўтрымання на хатні арышт.

У маі Дашука асудзілі на паўтара года «хатняй хіміі» за ўдзел у акцыі прадпрымальнікаў 10 студзеня. Справа ў тым, што ў хлопца не было афіцыйнай працы, таму ён фактычна знаходзіўся пад хатнім арыштам. Выходзіць на вуліцу дазвалялася толькі на дзве гадзіны на суткі. Аднак хлопцу часта даводзілася дапамагаць маці, якая працуе індывідуальным прадпрымальнікам. Бацька Дашука памёр незадоўга да суду.

Некалькі разоў падчас праверак міліцыянты не заспявалі Максіма дома, за што было вынесена пяць папярэджанняў.

Фігуранты «Працэсу чатырнаццаці» цяпер жывуць фактычна ва ўмовах хатняга арышту. За любое парушэнне заканадаўства кожны з іх можа апынуцца за кратамі. Некаторыя, як Тацццяна Цішкевіч і Аляксей Бондар, прынялі рашэнне з’ехаць з краіны.

У Беларусі з’явіўся пяты палітвязень цягам двух тыдняў.

**ЗП**

# Ізноў артыкул 193-1

18 лютага пракурор Баранавічаў Ігар Палыка вынес афіцыйнае папярэджанне старшыні баранавіцкай суполкі Саюзу палякаў у Беларусі і дырэктару Дома Польскага Тэрэсе Селівончык за актыўны ўдзел у дзейнасці незарэгістраванай арганізацыі.

Жанчыну вінавацяць у арганізацыі дастаўкі ў Дом Польскі друкаванай прадукцыі, у якой «падкрэсліваецца кіроўная роля Борыс А. у жыцці паланійных структур, што функцыянуюць у РБ», а таксама «змяшчаецца тэндэнцыйная інфармацыя аб сацыяльна-палітычнай сітуацыі ў РБ». Акрамя таго, актыўны ўдзел Т. Селівончык у дзейнасці незарэгістраванай арганізацыі выяўляецца ў «рэгулярным удзеле ў сходах прыхільнікаў Борыс А.» У выпадку рэцыдыву пракуратура будзе ставіць пытанне пра прыцягненне старшыні баранавіцкай суполкі СПБ да крымінальнай адказнасці, гаворыцца ў папярэджанні.

**Сямён Печанко**

# «Крыж выглядае не зусім эстэтычна

**хоць самалётам і верталётам ён, канечне, не перашкаджае». Лельчыцкага ксяндза ўсё ж аштрафавалі за крыж.**

Раённы архітэктар Вячаслаў Асіпенка і начальнік землеўпарадкавальнай і геадэзічнай службы Анатоль Бялоцкі абвінавацілі ксяндза Віталя Мышону ў незаконным захопе зямлі і невыкананні прадпісанняў органаў улады. У выніку суддзя Аляксей Бялоцкі пакараў а. Віталя штрафам у памеры 3 базавых адзінак (Br105 тыс.) Наконт зносу крыжа рашэння суд не вынес. Нагадаем, што раней райвыканкам дазволіў усталяваць крыж, але пазней чыноўнкі выставілі дадатковыя патрабаванні, падалі ў суд на пробашча парафіі і прайгралі справу.

Як высветлілася, чыноўнікі, акрамя ўсяго, маюць прэтэнзіі да эстэтычнага выгляду крыжа. На судзе архітэктар Асіпенка заявіў літаральна наступнае: «Ён самалётам і верталётам, канечне, не перашкаджае, але выглядае не зусім эстэтычна». Як паведамляе гродзенскі журналіст Андрэй Пачобут, які прысутнічаў на судзе ў Лельчыцах, з блізкіх да раённых уладаў крыніцаў яму стала вядома, што чыноўнікі хочуць, каб з крыжа прыбралі выяву Хрыста і надпіс на лаціне «In hoc signo vinces» («Гэтым знакам ты пераможаш»), а сам крыж падкарацілі на адзін метр і, магчыма, перанеслі на іншае месца.

**Сямён Печанко**

# Міхаіл Пашкевіч абраны кіраўніком «Маладых дэмакратаў»

У Мінску на Сядзібе Партыі БНФ 22 лютага прайшла II справаздачна-выбарчая канферэнцыя моладзевай арганізацыі АГП «Маладыя дэмакраты». На яе з’ехаліся 44 дэлегаты амаль з усіх рэгіёнаў краіны. Не былі прадстаўленыя толькі Віцебская і Магілёўская вобласці. У адсутнасць ужо выязнога старшыні АГП Анатоля Лябедзькі, які гэтымі днямі знаходзіцца за мяжой, дэлегатаў ад імя старэйшых таварышаў павітаў намеснік кіраўніка партыі Леў Марголін.


УЛАДЗЬ ГРЫДЗІН

На пасаду старшыні прапанавалі тры кандыдатуры — Міхаіл Пашкевіч, Аляксандр Сергіенка і Уладзімір Вуяк. Двое апошніх самаадхіліліся.

Вось такі падарунак атрымаў Пашкевіч на 23-і дзень нараджэння, які святкаваў акурат у гэты дзень.

На пасаду намесніка старшыні, таксама на безальтэрнатыўнай аснове, абраны Аляксандр Сергіенка.

**ЗП**

## СЦІСЛА

### Сям’я Джуста-Барначын апраўданая

Суд Генуі (Італія) апраўдаў сямейную пару Алясандра Джуста і Марыю-К’яру Барначын, якія абвінавачваліся ў выкраданні і ўтрыманні на працягу 20 дзён непаўналетняй беларускай сіраты Вікі Мароз. Суд не знайшоў у іх дзеяннях складу злачынства, паколькі яны «дзейнічалі ў абставінах крайняй неабходнасці». У сям’і ёсць паўтарагадовы сын. «Але Віка таксама наша дачка. Мы для яе тата і мама», — падкрэслівае італьянец.

**Паводле БелаПАН**

# «Коммерсант» пра візіт Саланы ў Мінск

Беларусь разам з Грузіяй і Украінай можа зрабіцца адным з ключавых партнёраў Захаду на постсавецкай прасторы, і выглядае, што дзеля гэтага Еўропа вырашыла не чакаць змены ўлады ў Мінску.

Калі гэты працэс пойдзе без збояў, то Расія можа не прычакаць прызнання Беларуссю Абхазіі і Паўднёвай Асеціі, піша выданне. «КоммерсантЪ» адзначае, што гэты тыдзень стаў рэкордным для беларускіх уладаў па колькасці добрых навінаў з Еўропы. Кульмінацыяй стаў візіт прадстаўніка Еўрасаюзу па пытаннях супольнай замежнай палітыкі і палітыкі бяспекі Хаўера Саланы. «Свой візіт ён назваў пачаткам «больш глыбокіх і цесных стасункаў паміж ЕС і Беларуссю», якая з'яўляецца важнай краінай для Еўрасаюзу» — адзначае газета.

«КоммерсантЪ» заўважыў, што Салана хоць і сустракаўся з прадстаўнікамі апазіцыі і праваабарончых арганізацый, усё ж на выніковай прэс-канферэнцыі не агучыў умоваў, на якіх ён збіраецца збліжацца з Мінскам ды не пракаментаваў пытанняў свабоды СМІ і сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі.

Газета робіць экскурс у найноўшую гісторыю дачыненняў Еўропы і Беларусі — ад вызвалення палітвязняў да візіту кіраўніка беларускага МЗС у Брусэль.

Выпады на адрас апазіцыі, якую Лукашэнка катэгарычна адмаўляецца бачыць у якасці пасярэднікаў у дыялогу з Захадам, могуць і не заўважыць у ЕС ды ЗША, адзначае «КоммерсантЪ». Бо іх куды больш цікавіць пытанне прызнання Беларуссю незалежнасці Абхазіі і Паўднёвай Асеціі.

**Сямён Печанко**

# Нашы будні

Сонечнай нядзельнай раніцаю 22 лютага на Юбілейнай плошчы натоўп разявакаў назірае за бел-чырвона-белым сцягам, што лунае над вуліцай Кальварыйскай. Стаю з малой у вазку і я. «Ужо суткі вісіць», — пазмоўніцку паведамляе мне валасаты юнак.

Тым часам пад'язджае пажарная машына з доўгай лесвіцай. Купка міліцыянтаў, чамусьці з аўтаматамі, работнікаў МЧС і колькі людзей у цывільным жмурацца, ці то на зыркае сонца, ці на бялютка-пунсовы сцяг у сінім небе.

Па-будзённаму, дзелавіта, выбралі маладзейшага міліцыянта, які спакойна, без страхоўкі палез у тое неба да сцягу. Цікаўных пабольшала. Што яшчэ можа весяліць нашых людзей у нядзельную раніцу, як не грамадзкі непарадак?

Каментары пакупнікоў з гарэлачнага аддзелу і каля кіёску «Белсаюздруку» супадалі — вось жа, нехта яшчэ й сцягі вешае... Маўляў, ёсць у некага ахвота. А вось у краме, пры касах, меркаванні людзей рэзка падзяліліся. Варта было аднаму дзядзьку буркнуць нешта нядобрае ў адрас тых, хто вешае сцягі, як касіркі й прадавачкі на яго навалiліся. Чамусьці клялі Маскву. Нашы сцягі, кажуць, ужо даўно час вывешваць, бо цэны растуць, заробкі мізарнеюць, а хто гэтага не разумее — сам прыдурак!

Тым часам сцяг ужо знялі. Радыя добраму надвор'ю і прыгодзе без рызыкі, міліцыянты незласліва камэнтавалі, як спрытна той сцяг быў закінуты на дрот над вуліцай. «Я ж табе казаў! Во як яны робяць, з дротам і грузам», — казаў астатнім старэйшы. Сцяг быў акуратна згорнуты.

**Праходзіў побач**
**СХ**

# Як пахне Беларусь?

**Кацярына Сцяпанава — студэнтка першага курсу ЕГУ. Гэтае яе эсэ перамагло на конкурсе твораў «Што для мяне Беларусь», праведзеным сайтам moladz.org у рамках кампаніі «Будзьма!»**

А вы ведаеце, як пахне Беларусь? Не, я кажу не пра пах чабору і купальскага вогнішча, не пра пах хвойнага лесу і свежаспечанага хлеба, не пра шыпшыну і кветкі з Багдановічавага «Вянка». Гэта занадта проста для таго, каб апісаць паветра, якім напоўнена мая краіна. Мая Беларусь пахне таннай гарэлкай і цвіллю ў непрапаленай печы, цыгарэтамі «Пушча» і каўбасой, скрадзенай з мясцовага мясакамбінату. Беларусь пахне сапраўдным жыццём.

А вы ведаеце, як выглядае Беларусь? Не, я кажу не пра кляновы лісток на мапе і бландынку ў нацыянальным уборы, не пра люстраныя азёры і ўсмешлівыя твары з кірпатымі насамі, не пра карціны Язэпа Драздовіча і вянок з канюшыны. Ніводзін з гэтых вобразаў не зможа адлюстраваць рэаліяў жыцця ў маёй краіне. Мая Беларусь выглядае, як старая інтэлігентка ў дыяментах на тэатральнай прэм'еры, як мурзатае шчаслівае вясковае дзяўчо, як салдат, які тайна адпраўляе смс дадому. Налюбавацца на яе не магу!

А вы ведаеце, як гучыць Беларусь? Не, я кажу не пра спевы салаўя і «Жалейку» Купалы, не пра народныя песні і звон ручаёў, не пра сакатанне конікаў у начным полі і Ірыну Дарафееву. Усё гэта занадта ціха для таго, каб мая краіна прыслухалася. Мая Беларусь гучыць размовай пра заробкі і брыдкімі анекдотамі, пустымі абяцаннямі на Кастрычніцкай плошчы і галасамі тэлевядучых нацыянальнага тэлебачання, яна гучыць сіпатым голасам і бязграматнай трасянкай. Слухаў бы ды слухаў...

А вы ведаеце смак Беларусі? Не, я кажу не пра спелыя ажыны і бабуліны дранікі, не пра самагонку і самы танны кефір, не пра квас і святочную куццю. Гэта нішто ў параўнанні з маёй краінай. Мая Беларусь мае смак пірагоў з капустай, якія маці гатуе для Паўла Севярынца, папяровай каўбасы ды бульбы, скрадзенай з калгаснага поля. Каму смачна, каму — не вельмі, але ямо.

А вы ведаеце моц Беларусі? Не, я кажу не пра казачных волатаў і асілкаў, не пра бойкі хлопцаў на вясковых завулках і не пра п'янкі там жа, не пра тысячы міліцыянтаў на вуліцах і не пра тое, як адзін з іх ударыў жонку Завадскага. Гэта ўсё прайграе маёй краіне.

Мая Беларусь моцная жанчынамі, якія адны выхоўваюць дзяцей, і песняй «Магутны Божа», людзьмі, якія выжываюць без заробкаў, і тымі, хто спадзяецца на лепшае, хлапцамі, што едуць рабіць у Маскву, і сапраўднымі патрыётамі.

А вы ведаеце, што такое Беларусь? Беларусь ваша, яго, яе, мая, наша. Гэта краіна, дзе, закусваючы папяровай каўбасой, усё роўна згадваюць народныя песні і казкі пра асілкаў. У нашай Беларусі, напоўненай пахам таннай гарэлкі, памятаюць тую гісторыю, што засталася на старонках спісаных падручнікаў, якія ўжо нікога нічому не навучаць. У маёй Беларусі пераключаюць канал з песняй Дарафеевай на навіны дзеля таго, каб даведацца, ці не здарылася чаго ў Маскве, дзе працуе сын. У нашай Беларусі жывуць самыя прыгожыя жанчыны і самыя дужыя мужчыны. Усё так, як казаў Караткевіч. У нашай Беларусі жывем мы.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

# На каго працуем?

**Ваенкаматы вядуць прыём заяваў грамадзянаў, якія хочуць атрымаць вайсковую адукацыю... у Расіі і Казахстане.**

Як зазначаецца ў абвестках, раённыя вайсковыя камісарыяты ажыццяўляюць прыём заяваў для адбору кандыдатаў з ліку цывільнай моладзі, якія хочуць паступіць у 2009 годзе ў вайсковыя навучальныя ўстановы Міністэрстваў абароны Расійскай Федэрацыі і Рэспублікі Казахстан.

Юнакоў прываблiваюць развязшчэннем ВНУ «ў сталічных і абласных гарадах з прыгожай архітэктурай, музеямі, гістарычнымі помнікамі».

Сэнс кампаніі — падрыхтаваць афіцэраў па «дэфіцытных спецыяльнасцях, па якіх падрыхтоўка кадраў у ВНУ Беларусі не праводзіцца». Каго ж беларусы падрыхтаваць не здольныя? Аказваецца, дэфіцытныя спецыяльнасці — «радыёсувязь, радыёвяшчанне і тэлебачанне» (пры наяўнасці БДУІР і БДУ), «шматканальныя і тэлекамунікацыйныя сістэмы» (пры наяўнасці БДУІР, прычым школа фізікі і радыётэхнікі нашай краіны лічыцца адной з наймацнейшых у свеце), «пракурорска-следчая праца» (!), «прымяненне аддзелаў радыёэлектроннай выведкі», «арганізацыя ваенна-аркестравай службы і дырыжаванне аркестрамі». Сапраўды, дырыжаваць аркестрамі беларусаў толькі старэйшы брат можа навучыць. Паралельна з прышчапленнем расійскага патрыятызму.

Вядома, Казахстан тут для адмазкі. Ніхто ў стэпы вучыцца з Беларусі не паедзе. А вось на навучанне ў Расіі хтосьці пакваліцца. Хоць узровень падрыхтоўкі там зусім не сучасны.

Дарэчы, што да Казахстану. Згодна са звесткамі казахскага Мінабароны, на сёння 200 казахаў па накіраваннях вучацца ў сапраўды перадавых вайсковых школах краінаў НАТА, і толькі ў 2008 годзе, як заявіў начальнік упраўлення МА Казахстану па падрыхтоўцы кадраў Ігар Мухамедаў, колькасць казахскіх курсантаў у замежных ВНУ павялічылася на 33%.

Натуральна, што такія абвесткі з'явіліся не з ініцыятывы пэўнага ваянкома. Гэта палітыка Мінска. Але ўсё адно сумна. Бо адна справа калі б беларускіх курсантаў пасылалі кудысьці атрымаць лепшыя веды. І зусім іншая — калі беларускіх хлопцаў зусім адкрыта, дый яшчэ з дапамогай бышцам бы беларускіх структураў, вярбуюць суседнія дзяржавы.

**Інфармацыю пра абвесткі даслаў у «НН» рэгіянальны партал «Свіслач»**

# Небяспечныя сувязі братоў Касціцыных

**Манрэальскае выданне La Presse надрукавала артыкул пра цеснае знаёмства беларускіх хакеістаў Андрэя і Сяргея Касціцыных з наркадылерам Паскуалем Маджолам.**

Як паведамляе газета, адзін з падазраваных у справе гандлю наркотыкамі, захоўванні і абароце какаіну, незаконным нашэнні агнястрэльнай зброі Паскуаль Маджола з'яўляецца «добрым сябрам» гульцоў клуба НХЛ «Манрэаль Канадыянс» беларускіх братоў Касціцыных. Гэта стала вядома газеце з паліцэйскіх крыніцаў.

Паскуаль Маджола быў арыштаваны раніцай 12 лютага, ён быў пасярэднікам між трыма бандамі, што дзейнічаюць на паўднёвым захадзе Манрэаля. Як высветлілі паліцэйскія, Маджола з'яўляецца вялікім аматарам хакею. Ён па некалькі разоў на тыдзень размаўляў з Сяргеем і Андрэем Касціцынымі. Гэта пацвердзілася раздрукоўкамі тэлефонных размоваў дылера з гульцамі.

Маджолу і Касціцыных часта бачылі разам у барах і рэстаранах бульвара Ларан у Манрэалі. Часам яны збіраліся пасля гульняў.

Паводле звестак La Presse, Маджола грае вельмі значную ролю ў жыцці братоў. Ён узяў Касціцыных пад сваё крыло адразу па прыездзе беларусаў у Канаду. Ён кіраваў пакупкамі хакеістаў, дапамагаў ім знайсці кватэры, аўтамабілі. Касціцыны не саромеліся тэлефанаваць Паскуалю, калі ім нешта трэба было — алкаголь, машыны, жанчыны і іншае. Яны ведалі, што Маджола хутка вырашыць іх праблемы.

Разам з Маджолам бачылі таксама яшчэ аднаго еўрапейскага гульца «Манрэаля» — чэха Гамраліка, але ён быў не настолькі блізкі да наркадылера, як нашы хлопцы.

Афіцыйная рэакцыя «Манрэаля» была прадказальнай: «Мы не ведалі пра гэтыя сувязі».

Андрэй Касціцын пасля гульні з «Пітсбургам» заявіў, што ведае Маджолу, але нічога не чуў пра яго нелегальную дзейнасць.

Цяпер Маджола можа выйсці на волю, калі ўнясе заклад у памеры 45 тысячаў даляраў. Гэта ўжо не першы суд над Маджолам. Раней яго судзілі за напад на афіцэра, а таксама за падробку крэдытных картак.

**Зміцер Панкавец**






# О спорт…

**Алімпійская чэмпіёнка памерла проста на зборах нацыянальнай каманды.**

Каміла Скалімоўская — чэмпіёнка Алімпійскіх гульняў у Сіднэі ў кіданні молату (2000), памерла 18 лютага ў Партугаліі, проста на зборах нацыянальнай зборнай.

Удзень дзяўчына жалілася на кепскае самаадчуванне, а падчас трэніроўкі страціла прытомнасць. Яе завезлі ў бальніцу, але выратаваць не змаглі.

Было ёй усяго 26 гадоў.

Перамагла на Алімпійскіх гульнях у Сіднэі ў 17 гадоў, стаўшы самай маладой польскай медалісткай на Алімпійскіх гульнях і самай маладой чэмпіёнкай і рэкардсменкай Польшчы.

Не выключана, што справа ў допінгу. Вялікі спорт цяпер стаў справай, небяспечнай для жыцця. Нярэдка маладыя спартоўцы паміраюць проста на пляцоўках.

**Рыгор Бацянскі**



## Першы беларускі ноўтбук

ААТ «Мінскае вытворчае аб'яднанне вылічальнай тэхнікі» выпусціла першую партыю айчынных ноўтбукаў — пераносных кампутараў.

Ноўтбукі «Калега» з дыяганаллю дысплэя ад 14 да 19 цаляў выраблены на базе працэсараў Intel Core Duo ці Core 2 Duo, а мабільная сістэма абароны захоўвае інфармацыю нават у выпадку ўдараў і вібрацый.

На выгляд беларускі ноўтбук падобны да HP Compaq 8220.

**Паводле БЕЛТА**

## Дзве АЭС, а не адна?

Беларусь магла б збудаваць не адну АЭС пад Астраўцом, а аж дзве — яшчэ адну на ўсходзе, на Краснапалянскай пляцоўцы.

Пра гэта марыць гендырэктар Аб'яднанага інстытуту энэргетычных і ядзерных даследаванняў «Сосны» Акадэміі навук Вячаслаў Куўшынаў.

Ён кажа, што два блокі маглі б працаваць там, а два — тут. Праўда, ажыццявіць другую будоўлю ён лічыць мэтазгодным толькі пасля 2030 года.

**МБ**



## Супертрыумф Вікторыі Азаранкі

Беларуска Вікторыя Азаранка стала пераможцай тэніснага турніру Cellular South Cup Title, што праходзіў у Мэмфісе (Тэнэсі, ЗША). У фінале адзіночнага разраду яна перамагла прадстаўнічку Даніі Караліну Вазняцкі — 6:1, 6:3.

Самае цікавае, што адразу пасля гэтага пачаўся фінал парнага разраду, дзе Азаранка і Вазняцкі выступалі разам. Беларуска-дацкі дуэт перамог Юліяну Федак/Міхаэлу Крайчак (Украіна/Нідэрланды) — 6:1, 7:6 (7:2).

Дзякуючы гэтым перамогам наша зямлячка зарабіла аж 220 000 даляраў.

**АГ**

# Зараднікі для тэлефонаў стануць універсальнымі

**Дамоўленасці пра гэта дасягнулі асноўныя вытворцы. Унізараднік будзе да таго ж энэргаэканомны.**

17 мабільных апаратараў і вытворцаў мабільных тэлефонаў у аўторак дасягнулі дамоўленасці па стандартызацы зараднікаў да большасці трубак да 2012 года.

Зараднікі стануць узаемазаменнымі. Ладаванкамі ад тэлефона адной маркі можна будзе жывіць любы іншы апарат. Да ініцыятывы далучыліся LG, Motorola Inc., Nokia Corp., Samsung, Sony Ericsson ды іншыя кампаніі.

Мала таго, што унізараднік стане зручным для карыстальнікаў, ён мае быць яшчэ і эканамічным. Эканомія электрычнасці складзе да 50%.

Рэч у тым, што ён, у адрозненне ад цяперашніх мадэляў, не будзе смактаць ток, калі не падлучаны да тэлефона. Большасць цяперашніх спажываюць электрычнасць нават калі на іх няма тэлефона на зарадцы. Да таго ж, цяпер не ўсякі зараднік і тэлефон падаюць сігналы пра поўную зарадку батарэі. Здавалася б, драбніцы, але ў сусветных маштабах гэта сапраўдны электраваміпірызм.

Больш за тое, штогод агульная вага зараднікаў, выкінутых у свеце за непатрэбнасцю, складае 51 000 тонаў. Гэтулькі смецця!

Карацей, суцэльныя плюсы і радасць, што жыццё не стаіць на месцы нават у часы крызісу.

**Мікола Бугай**

## Гербам Віцебшчыны будзе «Пагоня»

Герб і сцяг вобласці зацверджаны дэпутатамі аблсавету 17 лютага.

За аснову іх узяты адвечны герб Віцебскага ваяводства і губерні — старадаўняя крывіцкая «Пагоня».

У канчатковым варыянце герб будзе выглядаць так: у чырвоным полі французскага шчыта знаходзіцца выява «Пагоні», у левай руцэ вершніка — круглы шчыт з залатым шасціканцовым Ефрасіннеўскім крыжом. Шчыт абламоўваюць дзве дубовыя галіны з жалудамі, абкручаныя блакітнай стужкай. Вянчае герб вежавая карона з пяцці зубцамі.

**АК**

# Адам Глобус: Колькі можна жраць?

Крызіс зробіць нас больш сціплымі і патрабавальнымі да сябе. Гутарка з пісьменнікам і выдаўцом **Адамам Глобусам** пра сусветны крызіс і пра грошы.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**«Наша Ніва»: Беларусы баяцца крызісу?**

**Адам Глобус:** За ўсіх не скажу, але я не баюся. Можа быць, беларусы баяцца яго найменш, бо ў нас мала што ёсць, каб згубіць. Мы сціпла жылі, сціпла жывем. Не баяцца.

**«НН»: А па Вас асабіста крызіс ударыў?**

**АГ:** Гэта сусветны крызіс, ён ударыць па ўсіх. Сказаць, што гэта не пра мяне, то пра мяне. Ударыў моцна і прымусіў задумацца шмат над чым.

**«НН»: Напрыклад?**

**АГ:** Ёсць такая формула, што 30 капеек значна лепш за 20 капеек. Мы жывем у такі час, які можна назваць часам лічбаў. Нам не важна, якая лічба, галоўнае, каб яна была большай. Прычым большая лічба ва ўсім. Цяпер жа высветлілася, што 30 проста больш за 20 капеек, але не лепш. Мы трапілі ў крызіс з прычыны перавытворчасці. Мы нарабілі ўсяго значна больш, чым нам трэба. Нам не трэба дваццаці аднолькавых па цане чайнікаў, якія прапануюць у краме. Дастаткова было б пяці. Нам не трэба столькі машын, газет, кніжак. Мы нарабілі сабе на тры жыцці наперад. Але мы адно жыццё жывем. Але чалавецтва пайшло іншых шляхам. Вось збудаваў чалавек кватэру, а чаму б яшчэ адну не збудаваць, чаму тры не збудаваць?

**«НН»: Кажуць жа, запас бяды не чыніць.**

**АГ:** Ведаеш, чыніць. Як высветлілася, вось такі неразумны запас начыніў нам гэтай бяды. Чыніць запас бяду. Асабліва ядзерны.

**«НН»: Кніжак падчас крызісу чытаць стануць меней?**

**АГ:** Чытаць павінны болей, але чамусьці не чытаюць. Падчас крызісу павінен вызваліцца час, усе павінны менш працаваць. Адпаведна, што рабіць? Хадзіць глядзець футбол, больш чытаць, больш глядзець кіно. Мусіць, крызіс яшчэ не такі моцны, каб чытаць кніжкі. Але наступіць. Спадзяюся, што чытаць будуць больш.

**«НН»: А хіба падчас крызісаў людзі думаюць пра мастацтва, а не пра свой жывот?**

**АГ:** Дык назапасілі ж ужо. Колькі можна жраць? Тут сапраўды можна задумацца, што рабіць далей, хопіць займацца вытворчасцю. Можа, варта падумаць пра нешта лепшае? Таму ілюзорны свет, які прапануе мастацтва, робіцца больш прывабным. Ён ратоўвае псіхіку чалавека. Сапраўды ж, лепш музыку паслухаць ці дзяўчыну ў тэатр звадзіць.

**«НН»: А для творчасці крызіс — зручны час?**

**АГ:** Для мастацтва крызіс не такая ўжо і спакуслівая тэма. Літаратура заўсёды цікавілася і цікавіцца тэмай кахання, любові, смерці. А што крызіс? Раман «Фінансіст» напісаць. Ну, напішам.

**«НН»: У Беларусі Вы ўжо адчуваеце пачатак крызісу?**

**АГ:** Адчуваю. Уласна, мне даводзіцца скарачаць вытворчасць, калектыў. А калі хто гэтага не робіць, то гэта глупства. Што становўчага ў крызісе, дык гэта тое, што мы павінны спыніцца і паглядзець, дзе можам быць больш сціплымі. Мільянер павінен навучыцца ездзіць у трамваі, як у Швейцарыі. І гэта нармальна. А вайскоўцам трэба навучыцца насіць адзін пагон, навошта ім два?

**«НН»: А хто, багатыя ці бяднейшыя, лягчэй перажыве крызіс?**

**АГ:** Усе аднолькава будуць перажываць. Багатыя будуць калаціцца за гэтыя свае 30 капеек. Бедныя будуць перажываць за кавалак хлеба. Я стаяў у чарзе па хлеб, стаяў падоўгу, па пяць гадзінаў. Ведаю, як гэта цяжка — стаяць зімой у чарзе па хлеб. Не хачу цяпер, каб мой унук стаяў. Але гэта яшчэ не вайна. Проста ёсць выхад з сусветнага крызісу — развязанне сусветнай вайны. Вайна — гэта самае страшнае.

**«НН»: А ўцякаць людзі з Беларусі будуць у пошуках лепшай долі?**

**АГ:** Не буду рабіць такі прагноз. Я вось працую ў Маскве, дык там горш. Горш у настроях. Там крызіс абмяркоўваюць ва ўсіх СМІ, і гэта прыгнятае. Зрэшты, там лягчэй растлумачыць такія рэчы, як звальненні 30% супрацоўнікаў прадпрыемства. І там зразумеюць. У нас жа, калі я прыйду і скажу, што пакіну дзве траціны, а траціне давядзецца шукаць працу, то на мяне будуць глядзець досыць здзіўлена.

**«НН»: І як кажаце супрацоўнікам, што яны звольненыя? Людзі крыўдзяцца?**

**АГ:** Крыўда — гэта ўвогуле асноўнае пачуццё беларусаў, яны крыўдзяцца на ўсё. Я стараюся патлумачыць. Ну калі няма з чаго плаціць? Я працую ў рэальнай эканоміцы, колькі кніжак прадалося, столькі мы атрымаем грошай. І гэтыя грошы будуць размеркаваныя так і так. Нам ніхто не плаціць стыпендыі, пенсіі, нейкіх датацый. Не з радасным пачуццём людзі сыходзяць, канечне. Разумнейшыя ўжо рыхтаваліся, беларусы ціха рыхтуюцца. Даведваліся, высвятлялі, шукалі іншыя месцы. Трэба асобна разглядаць кожную сітуацыю.

**«НН»: А якія шляхі выхаду з крызісу Вам бачацца?**

**АГ:** Па-першае, трэба на сябе паглядзець і навучыцца жыць адно нашае жыццё, а не на тры жыцці наперад. Спыніць гэтае назапашванне. Па-другое, навучыцца радавацца таму жыццю, якое ў нас ёсць цяпер, а не якое будзе ці ўжо было. Навукоўцам заўсёды трэба нешта паляпшаць, нешта падкручваць у гэтым свеце. Вось для мяне, напрыклад, Мічурын не аўтарытэт, бо мне здаецца, што яблыні і так добра квітнеюць. І колер неба мяне задавальняе такі, як ёсць, я не збіраюся яго перафарбоўваць. Зрэшты, Апакаліпсіс таксама не трэба выбудоўваць. Што вось крызіс, і пасля яго мы жыць не будзем. Проста я лічу, што навуковыя і рэлігійныя каштоўнасці падчас крызісу будуць меншымі, а мастацкія і эратычныя — большымі.

**«НН»: А Вы самі адмаўляецеся ад чаго-небудзь?**

**АГ:** Канечне. Напрыклад, я, хутчэй за ўсё, закрыю сваё выдавецтва «Сучасны літаратар» і перайду працаваць у «Харвест». Утрымліваць дзве структуры ўсё ж не вельмі добра ў дадзеных умовах. Я ўвогуле люблю адмаўляцца ад чаго-небудзь. Чаму беларусы ў больш выгадных умовах? Бо яны ніколі не шыкавалі. Пантоў менш. Тыя ж прыбалты лічылі, што заўтра яны стануць Галандыяй, а народ расчараваўся, што Галандыяй яны не сталі. Была ў нас спакуса — пакіраваць Расіяй, але хутка прайшла. Беларусы заўсёды вылучаліся гэтай адпаведнасцю сітуацыі, прыстасавальніцтвам. І раптам высветлілася, што гэта не так і кепска. У нас няма гэтага дурнога футурыстычнага аптымізму, што заўтра ўсё будзе выдатна. Мы разлічваем на сярэдняе. Ну, трошкі будзе лепш, трошкі горш. Мы не разлічваем схапіць, заваяваць, забраць, жыць за кошт крэдытаў. У Беларусі ніколі не любілі пазычаць грошы, гэта на побытавым узроўні. Потым саромеліся спытацца, а калі ты мне вернеш, чырванелі, бо няёмка. І пірамiды фінансавыя ў нас былі значна ніжэйшыя, але і падаць з іх менш балюча.

**«НН»: А як увогуле беларусы ставяцца да грошай?**

**АГ:** Добра. Як мяне дзяды навучылі, так і я цяпер унука вучу. Я ніколі не выкідаў грошай. Чаму? У майго дзеда былі царскія, польскія капейкі. І ён паказваў, у што можа ператварыцца гэтая капейка. Калі прабіць гэтую капейку, то ў гаспадарцы будзе выдатны цвік з шырокай шляпкай. І так можна выкарыстоўваць грошы. Усе дзяды і бабы спрадвеку вучылі шанаваць грошы, давалі грошы дзецям на касцюм, на адукацыю, хто на што мог. Проста ў нас вялікіх грошай ні ў кога не было і вялікай спадчыны. Насамрэч, у нас і сёння няма багатых і бедных людзей, таму што ні ад аднаго, нават самага багатага, грошы не пераходзілі ў спадчыну.

**«НН»: А чаму спадчыны няма?**

**АГ:** Было 70 гадоў Савецкай улады. І што ты мог бы аддаць у спадчыну? Мы і сёння зямлю яшчэ не можам набываць. А што такое грошы? Я набываю зямлю, і гэта мая спадчына. Нашы беларускія грошы яшчэ напрадзе. Гэта тыя грошы, якія прайшлі ад дзеда ці прадзеда да ўнукаў і праўнукаў. Чаму чалавек у Швейцарыі банкір? Бо ў яго прадзед быў банкір. А чаму ў нас банкір? Ну бо так атрымалася, што сярод пацаноў самы разумны. У савецкі час у нас былі не зусім грошы. Былі нейкія чэкі, купоны. Нас вучылі, што мастак за свой твор атрымлівае не грошы, а ўзнагароду. А ягоны твор належыць савецкаму народу. Дык па савецкім законе я нават апавяданне ў спадчыну пакінуць не магу.

**«НН»: А што б Вы, як мастак, адлюстравалі на беларускіх грошах?**

**АГ:** Шчыра кажучы, я не прыхільнік таго, каб на грошах былі твары нашых вялікіх паэтаў. Мне вельмі падабаецца гісторыя з мастамі, якая адлюстраваная на еўра. Гэта падабаецца мне больш за партрэты прэзідэнтаў. Не таму, што я прэзідэнтаў не люблю. Я лічу, што чалавек на грошах — не зусім правільна, лепш абысціся нейкімі знакавымі сімваламі, архітэктурай, нават абстрактнымі арнаментамі. Яшчэ на грошах павінна быць выразная, вялікая, добра намаляваная лічба, яна першасная. Бацька хацеў, каб я стаў матэматыкам, а я не паслухаўся і стаў мастаком. Можа, і дарма.

**«НН»: Бо грошы б лепш лічылі?**

**АГ:** Ну. У наш час матэматычны жыў бы лепш. Не перажываў бы.

**«НН»: А так перажываеце?**

**АГ:** Перажываю. За людзей перажываю. Мяне найбольш у свеце хвалюе чалавек. Жывы чалавек, не той, які быў, які будзе, а той, з якім я жыву на гэтым свеце. Хацеў бы жыць з Дантэ, але я жыву з Віцем Шніпом. І гэта добра.

**«НН»: Дык які Ваш прагноз, што нас чакае?**

**АГ:** Крызіс будзе паглыбляцца. Грошай будзе ўсё менш і менш. Да новага году гэта не скончыцца. Будзе цяжка. Але мы навучымся паводзіць сябе адпаведна сітуацыі. Мы станем больш сціплымі і больш патрабавальнымі да сябе.

**Гутарыў Зміцер Панкавец**

**Адам Глобус**
сапраўднае імя Уладзімір Вячаслававіч Адамчык
нарадзіўся 29 верасня 1958 у Койданаве
(Дзяржынску). Пісьменнік, мастак, выдавец.

# Самая дарагая кватэра ў Беларусі была прададзеная ў Драздах

Нацыянальнае кадастравае агенцтва падсумавала вынікі 2008 года на рынку нерухомасці.



9994 аперацый па куплі/продажы кватэраў за год у Мінску — адна з сухіх і малацікавых лічбаў, якая не кажа ні пра што, калі не ўчытацца ў падрабязнасці некаторых продажаў.

Красавіком 2008 года датуецца самая шакавальная пакупка года. За кватэру ў доме па адрасе Піянерская, 32 невядомы заплаціў амаль 6 мільярдаў рублёў! Па леташнім курсе валюты гэта крыху больш за 2,7 мільёны даляраў. Можна было б меркаваць, што за такія грошы набыты як мімімум пентхаўз з басейнам і верталётнай пляцоўкай. Але купленая кватэра — усяго толькі двухпакаёўка! Такім чынам атрымліваецца, што квадратны метр каштаваў 33 тысячы даляраў.

Вядома, гэта найхутчэй памылка. Прыпісалі лішні нулік. Гаворка ідзе «ўсяго» пра 600 мільёнаў рублёў.

Па ўсёй той жа статыстыцы, вуліца Піянерская, што ляжыць каля павароту з праспекту Машэрава ў Дразды, аказалася самай дарагой у сталіцы. Апроч вышэйзгаданай кватэры, там былі прададзеныя яшчэ чатыры, даражэйшыя за мільярд рублёў. Шасціпакаёвыя апартаменты ў доме №16 каштавалі 1.087.165 тысячаў, а шасціпакаёўка ў тым жа доме №32 — 1.441.290 тысячаў, ці 670 тысячаў даляраў па леташнім курсе.

Карэспандэнт «НН» наведаў Піянерскі пасёлак, дзе і знаходзяцца кватэры з зусім не піянерскімі коштамі. Вуліца Піянерская дала назву аднайменнаму пасёлку на паўночным захадзе беларускай сталіцы. Срэбранае кальцо, Залатая вуліца, Ізумрудны і Агатавы завулкі — ужо па назвах зразумела, што перад намі — беларуская Рублёўка. Вокны некаторых дамоў выходзяць на дабудаваную «Мінск-Арэну», за ляском месціцца рэзідэнцыя Лукашэнкі, непадалёк цячэ Свіслач... На тэрыторыі пасёлка ёсць нават клініка касметычнай хірургіі.

Па перыметры пасёлак абнесены агароджай, але ўваход адкрыты. Увогуле ж, Піянерскі пакідае ўражанне нейкага бязлюднага царства. Паўсюль яшчэ ідзе будоўля, таму то тут, то там шнараць самазвалы і грузавыя машыны. Але паколькі людзі перасоўваюцца выключна на машынах, вулачкі зусім пустыя. Ніводнага жыхара сустрэць не давялося.

Дом па адрасе Піянерская, 32 нічым не вылучаецца між іншых збудаванняў. Такіх самых пабудоваў тут яшчэ пяць. Гэта 16-кватэрныя дамы з прадугледжанымі падземным паркінгам, бясшумным ліфтам, уласнай газавай кацельняй.

На жаль, дом яшчэ не заселены, таму журналісту трапіць у яго немагчыма. Праз вокны бачна, што аздобныя працы ўжо заканчваюцца, і хутка багатыя беларусы змогуць атрымаць асалоду ад камфортнага жылля.

На сайце агенцтва нерухомасці «Атолінвест», якое да гэтага часу прадае кватэры ў самым дарагім доме Беларусі, выстаўленыя яшчэ 4 кватэры, дзве з якіх — двухузроўневыя. Але ў эканамічны крызіс цэны на элітнае жыллё таксама пайшлі ўніз.

Квадратны метр у двухпакаёўцы плошчай 86,4 м² з кухняй 13,5м² будзе каштаваць 2500 даляраў (без адштукавання). У дома ўжо падрыхтаваны тэхнічны пашпарт, таму вось-вось адбудзецца засяленне, — тлумачаць у «Атолінвест».

216 000 даляраў за кватэру — гэта сума, роўная сённяшняму заробку сярэднестатыстычнага беларуса за 55 гадоў. Як кажуць, без каментароў.

З іншага боку, 2500 даляраў за квадратны метр у найпрэстыжнейшым раёне — гэта адносна мала проці цэнаў у такіх кварталах у сталіцах суседніх краінаў, што ёсць вынікам адсутнасці попыту. Заможныя людзі ў нашай краіне ёсць, толькі іх не мала, а зусім мала.

**Ягор Марціновіч, фота аўтара**







**Не ўсе купляюць кватэры. У 10% сямейных гаспадарак Беларусі даход на 1 чалавека меншы за 200 тыс. рублёў. Мама з дзецьмі грэюцца каля печкі. Мінская вобласць.**

## У Мінску ліквідаваная падпольная порнастудыя

з відам на галоўны праспект гораду.

Як паведамілі БелаПАН у галоўным упраўленні па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю МУС, 20 лютага на здымнай кватэры былі затрыманыя грамадзянін Беларусі і грамадзянін Расіі, якія з 2007 года займаліся вырабам фота- і відэапрадукцыі парнаграфічнага зместу для распаўсюджання яе ў Інтэрнэце.

Порнастудыя размяшчалася ў кватэры дома на праспекце Незалежнасці.

Устаноўлена, што ў здымках бралі ўдзел больш як 100 маладых дзяўчат мадэльнага выгляду.

Распачатая крымінальная справа па ч. 2 арт. 343 КК («Распаўсюджанне парнаграфічных матэрыялаў і прадметаў»).

**Вячаслаў Будкевіч, БелаПАН**

## Абменны пункт у «Прасторы» абчысцілі, як у кіно

Рабаўнік скраў больш за 80 тыс. даляраў з абменніка, выдаўшы сябе за інкасатара, а пасля ўжыўшы супраць касіркі электрашокер.

Дзёрзкі напад адбыўся ўвечары 20 лютага. Прыкладна ў 20.45 невядомы ў камуфляжы пранік у памяшканне пункту абмену валютаў у гіпермаркеце «Прастор», выдаўшы сябе за інкасатара.

Аапынуўшыся ў канторцы, ён ужыў электрашокер, прапусціў праз касірку пару тысяч вольт, згроб 40 249 даляраў ЗША, 8 315 еўра, 69 тыс. расійскіх рублёў і 80 млн. беларускіх.



Усяго ў пераліку на даляры — больш за 80 тыс.

Маскоўскі РУУС распачаў крымінальную справу па ч. 3 арт. 207 КК (разбой).

У банку ад каментароў пакуль адмаўляюцца. Касірка правяла панядзелак на допытах і псіхалагічных кансультацыях.

Злачынца не хаваў свайго твару, таму міліцыя хутка выдала ягоны фотаробат.

**Адар'я Гуштын**

**З каментароў на сайце НН да артыкулу**

Хоць ад адным чалавеку можна сказаць, што ён пераадолеў крызіс у самым зачатку.

**Кнехт**

# Спажыванне алкаголю ў Беларусі дасягнула гістарычнага рэкорду

**За мінулы год кожны беларус выпіў у сярэднім 12,4 літра ў пераліку на чысты спірт. Планка, пасля якой пачынаецца актыўная дэградацыя чалавечага патэнцыялу супольнасці, — 8 л на чалавека за год.**

Такія звесткі на паседжанні прэзідыуму Савету міністраў па абмеркаванні дырэктывы прэзідэнта № 1 агучыў міністр аховы здароўя Беларусі Васіль Жарко. Паводле яго інфармацыі, з 2005 па 2008 год спажыванне чыстага спірту на душу насельніцтва ўзрасло ў 1,3 раза.

Наўрад ці гэта кагосьці здзівіла. Беларусы з году ў год дэманструюць усё большую актыўнасць у паглынанні алкаголю. Інтэрпрэтацыя гэтай жа інфармацыі намеснікам міністра гандлю Беларусі Міхаілам Свянціцкім на паседжанні калегіі міністэрства ў канцы студзеня выглядае цікавейшай.

Як заявіў службовец, так шмат, як летась, беларусы не пілі ніколі. «Гэта новы гістарычны максімум», — адзначыў рэкорд М.Свянціцкі.

Паводле ягоных словаў, яшчэ ў 2005 годзе гэтая лічба складала 9,4 літра на чалавека за год і ўжо здавалася вялікай і нават жахлівай: «Пытанне аб насычэнні рынку ўжо не стаіць. Такая тэндэнцыя пагражае дэмаграфічнай сітуацыі ў краіне».

Планка, пасля якой пачынаецца актыўны працэс выраджэння і дэградацыі нацыі, даўно вядомы — восем літраў абсалютнага алкаголю на чалавека ў год. Беларусы перавысілі дапушчальную мяжу ў паўтара разы. Прычым, калі арыентавацца на дадзеныя статыстыкі, мы пачалі дэградаваць яшчэ з 2000 года.

З 1990 да 2007 года спажыванне абсалютнага алкаголю на душу насельніцтва павялічылася больш чым у 2 разы — з 5,7 літра да 10,6 літра.

Пры гэтым, як лічаць у Міністэрстве аховы здароўя, фактычна насельніцтва краіны спажывае спіртных напояў больш, бо афіцыйнай статыстыкай не ўлічваецца алкагольная прадукцыя, якая выраблялася саматужным спосабам і рэалізуецца з утойваннем ад уліку і падаткаабкладання.

«Па колькасці спіртных напояў на душу насельніцтва Мінск уваходзіць у тройку лідэраў сярод еўрапейскіх сталіцаў — амаль 12 літраў абсалютнага алкаголю на чалавека за год.

У такой жа колькасці п'юць толькі ў Маскве і Вільні — па 56 бутэлек гарэлкі за год на аднаго чалавека», — цытуе «Інтэрфакс-Захад» сталічных нарколагаў.

Вядома, увязваць паступовае скарачэнне колькасці беларусаў толькі з алкагалізацыяй ніхто не збіраецца. Але без уплыву гарэлкі, «чарнілаў» і г.д. тут не абыходзіцца. Толькі за мінулы год, паводле Міністэрства аховы здароўя, у краіне было здзейснена 2 662 самагубствы, з іх 60% — у стане алкагольнага ап'янення, ад атручвання алкаголем загінула больш за 2,5 тыс. чалавек.

А паводле звестак міністра МУС Уладзіміра Навумава, кожнае трэцяе злачынства (з больш чым 158 тысяч) у 2008 годзе было здзейсненае асобамі ў стане алкагольнага ап'янення, і амаль палова пацярпелых у грамадскіх месцах таксама знаходзіліся ў нецвярозым стане.

У 2006 годзе з'явілася Дзяржаўная праграма нацыянальных дзеянняў па папярэджанні і пераадоленні п'янства і алкагалізму на 2006—2010 гады. Дакументамі былі прадугледжаны шэраг мераў, у выніку якіх узровень спажывання алкагольнай прадукцыі на душу насельніцтва ў пераліку на абсалютны алкаголь павінен знізіцца ў 2010 годзе да 7,8 літра. Усё гэта былі паперкі, што не маюць дачынення да рэальнасці.

Напрыклад, урад кожны год павялічвае квоты на аб'ёмы вытворчасці алкагольнай прадукцыі. Як перадае БЕЛТА, у адпаведнасці з пастановай Саўміна ад 2 снежня 2008 года №1842, на 7,3% у параўнанні з 2008 годам павялічыцца квота на вытворчасць гарэлкі і лікёра-гарэлкавых вырабаў, што складзе 16,269 млн. дал. На 5,4% у параўнанні з 2008 годам павялічыцца квота на выпуск каньяку — да 270 тыс. дал, вытворчасць савецкага шампанскага і іншых ігрыстых вінаў узрасце на 12,4% — да 1,4 млн. дал.

Паводле Белстата, у 2008 годзе продаж гарэлкі павялічыўся на 8,1%, лікёра-гарэлкавых вырабаў — на 16,8%, вінаградных вінаў — на 3%.

У прынцыпе, цяжка чакаць, што дзяржава адмовіцца больш зарабляць на алкаголі. Але тады не зразумела, з чаго раптам беларусы стануць менш піць. Асабліва калі ў краіне крызіс, а расслабляцца ў спортзалах і на стадыёнах шмат каму не ў кайф.

«Дырэктыўныя метады змагання з п'янствам састарэлі», — кажа дырэктарка ААТ «Макані Коўчынг Цэнтр» Тамара Янкевіч.

Па словах трэнера цэнтру Юліі Мартынюк, «да залежнасці, у тым ліку і алкагольнай, вядзе неразвітасць унутранага свету. Нуда, унутраная пустэча і як вынік — зліццё з чымсьці лёгкадаступным».

Яна лічыць, што «пачынаць вырашаць праблемы трэба з сям'і».

**Андрэй Кажамякін, naviny.by**

# Як у Беларусі б'юцца з п'янствам?

**Новыя і новыя праекты, акцыі распрацоўваюць і прапаноўваюць Міністэрства унутраных справаў і Міністэрства аховы здароўя. Вось самыя маштабныя з іх.**



PHOTOBYMEDIA.NET

### На працоўным месцы больш не піць!

Дырэктыва №1 Прэзідэнта, якая з'явілася ў 2004 годзе, забараніла ўжываць алкагольныя напоі на працоўным месцы.

### Апошняе кітайскае папярэджанне

У барацьбе з п'янствам і дэбашырствам правапарушальнікам выносяць вымовы, папярэджваюць, чытаюць лекцыі і паказваюць відэафільмы прафілактычнага зместу. У Віцебску нават арганізоўваць круглыя сталы з удзелам алкаголікаў, які адбылі тэрмін у лячэбна-працоўным прафілакторыі (ЛПП). Калі алкаголікі не змяняюцца і працягваюць асацыяльны лад жыцця, іх адпраўляюць у ЛПП.

### Вылечым… працай

У ЛПП накіроўваюць па рашэнні суду для ізаляцыі і абавязковай працы. Тэрмін — год-паўтара. Лячэнне ад алкагалізму, медыкаментознае альбо псіхатэрапеўтычнае, тут ажыццяўляецца толькі па жаданні. Лячэнне іншых хваробаў — толькі па медыцынскіх паказальніках.

ЛПП — установа з досыць жорсткімі правіламі: ізаляваным праваапарушальнікам, напрыклад, нельга мець дакументы і грошы.

Вядома, што большасць алкаголікаў пасля ЛПП п'юць, як і раней. 30-35% — эпізадычна. Тых, хто цалкам перамог хваробу, — не больш за 5%.

Нядаўна алкаголікаў сталі адпраўляць у лячэбна-працоўныя прафілакторыі яшчэ і з аркестрам, прамовамі і падарункамі (адбылося гэта ў Мінску і Гомелі).

### Дошкі ганьбы

Ініцыятыва вывешваць фотаздымкі алкаголікаў у грамадскіх месцах належыць уладам Старых Дарог. Фотаздымкі «асацыяльных элементаў» можна ўбачыць не толькі на стэндзе, але і ў раённай газеце. Дошкі ганьбы актыўна выкарыстоўваюць і ў Брэсцкім рэгіёне: на 256 стэндах размяшчаюцца фота п'яніцаў і нелегальных гандляроў алкаголем.

### Звярнуцца да Бога

...Заклікаюць людзей, якія хварэюць на алкагалізм. У Мінску алкаголікаў будуць адвозіць у царкву на служэнні. У Слуцку праваслаўныя святары заклікаюць перамагчы духоўныя праблемы зваротамі да Бога. У віцебскай вобласці ёсць вёска Мосар. Тамтэйшы ксёндз Булька выкараняе п'янства ўсімі даступнымі спосабамі.

### «Сухія» дні

Акцыя гэтага года — дні цвярозасці, якія пройдуць ва ўсіх гарадах. У адзін з дзён, прызначаных Міністэрствам унутраных справаў, грамадзянам на іх жа карысць не дадуць магчымасці набыць алкагольныя напоі.

### Пасля 22.00 гарэлка забароненая

У 2007 годзе па ініцыятыве МУС ва Урад былі унесены законапраект, які абмежаваў час гандлю алкагольнымі напоямі з 9 да 22 гадзінаў. Гэта датычыцца ўсяго асартыменту спіртнога, якое прадаецца ў сетцы рознічнага гандлю.

### «Абмыць» зарплату не атрымаецца

Прадстаўнікі МУС прапаноўваюць забараніць продаж алкаголю ў крамах у дні выдачы авансу і зарплаты. У ведамстве лічаць, што правядзенне дзён цвярозасці падчас фінансавага пад'ёму грамадзян будзе найбольш эфектыўным. Арыентавацца на час выдачы грошай трэба па самых буйных прадпрыемствах гарадоў: у Жодзіна — «БелАЗ», у Салігорску — «Беларуськалій».

Апошняя ініцыятыва стала найбольш вядомаю: як пра экзатычнае ноў-хаў пра яе напісалі СМІ ва ўсім свеце. Нідзе больш такога няма.

**Адар'я Гуштын**

# Забілі 18-гадовага аднавяскоўца і расчлянілі

**У Лагойскім раёне 22 лютага затрыманыя два 30–гадовыя жыхары вёскі Лагаза, падазраваныя ў забойстве аднавяскоўца.**

Здарылася гэта пасля п'янкі. Хлопца забілі, а пасля вывезлі на санках за вёску, разабралі на кавалкі і закапалі. Парэшткі знойдзеныя.

Распачатая крымінальная справа па ч. 2 арт. 139 (забойства).

Адзін з падазраваных ужо судзімы за крадзеж, хуліганства, другі — за крадзеж і нанясенне цяжкіх цялесных пашкоджанняў.

**БелаПАН**

## Як жыхары Свіслачы змагаюцца з райвыканкамам за рамонт дамоў

**Жыхары Свіслачы (Пухавіцкі раён) неаднаразова звярталіся ў КУП «Жылкампаслугі Свіслач» з заявамі што да кепскага стану ацяплення і праблемаў з эксплуатацыяй жылых будынкаў.** Адказ быў прыкладна такі: «Вывучым сітуацыю і пры наяўнасці сродкаў заплануем работы».

Такія адпіскі на фоне мокрых сценаў не задавальнялі людзей. Некалькі жыхароў дома №27 пры дапамозе незалежнай дэпутаткі Свіслацкага пассавету Харламавай Вольгі дамагліся-такі мінулай зімой рамонту даху і выплаты кампенсацыі з боку КУП «Жылкампаслугі Свіслач».

Аднак з новым ацяпляльным сезонам праблемы вярнуліся. І людзі з дамоў №№25, 27, 29 і 31 вырашылі аб’яднацца дзеля абароны сваіх інтарэсаў. Была накіраваная калектыўная скарга ў райвыканкам. З улікам прыняцця закону «Аб абароне правоў спажыўцоў паслуг ЖКГ» такі дакумент прымусіў чыноўнікаў дзейнічаць.

І вось 11 лютага ў Свіслачы працавала камісія на чале з намеснікам старшыні Пухавіцкага выканкаму ў пытаннях архітэктуры, будаўніцтва й работы ЖКГ.

Пасля агляду кватэраў «заяўляльнікаў» і размоваў з людзьмі яе начальнік, спадар Кучко, і кіраўнік КУП «Жылкампаслугі Свіслач» спадар Людчык вымушаныя былі прызнаць праблему пасёлка. «Усе дамы Свіслачы патрабуюць цеплавой рэабілітацыі. Аднак… на гэта няма сродкаў», — казалі яны.

Такі адказ не задаволіў людзей, і яны выказалі намер «дапамагчы сваімі заявамі пошуку грошай». У выніку сп. Кучко запэўніў людзей, што неўзабаве будуць запрошаныя спецыялісты з цеплавізарамі дзеля вызначэння найбольш праблемных будынкаў. І на падставе іх заключэння будуць запланаваныя работы. Магчыма, ужо цягам 2009 года.

Аднак жыхары маюць намер чакаць не болей за месяц. Пасля будуць прымаць рашэнне пра запрашэнне такіх спецыялістаў сваімі сіламі і па выніках экспертызы праз суд дабівацца прывядзення дамоў у належны стан. Тым болей, што новае заканадаўства адкрывае для гэтага досыць вялікія магчымасці.

Падобнае аб’яднанне людзей для абароны сваіх інтарэсаў яшчэ, на жаль, досыць рэдкая з’ява. У той жа час, як зазначыла дэпутатка Харламава: «Добра, што людзі пачалі аб’ядноўвацца для абароны сваіх законных правоў. Такія захады рана ці позна непазбежна прывядуць да паляпшэння сітуацыі і вырашэння багатай колькасці мясцовых праблем».

**Свіслачанін**

## Леаніду Гаравому — 50

**Ірына Вештард, Міхась Варанец, Міхась Гіль, Віктар Ярашук... Вось цяпер і Леанід Гаравы. І яму спаўняецца пяцьдзесят. І ў яго юбілей.**

Меўся я паехаць у гэты дзень на паўночны ўсход Беларусі, каб пабачыць былы павятовы горад Гарадок, а ў Гарадку — помнік Тарасу на Парнасе.

Вядома, вядома, маім паваду́рам па Гарадку быў бы знаўца гісторыі гэтага краю, даўні таварыш па Грамадзе Леанід Гаравы.

Я назваў Леаніда ў шэрагу таварышаў. Бо ён, як і Ірына Вештард, і Міхась Варанец, і Міхась Гіль, і Віктар Ярашук, прыйшоў у беларускую сацыял-дэмакратыю ад яе пачаткаў. Дзякуючы яму, у Гарадку, як і ў Смаргоні, Слоніме, Паставах і Пінску, склалася партыйнае ядро.

Дырэктар школы, Леанід не збаяўся за сваю кар’еру і пасля дзяржаўнага перавароту 1996 года не здаў партыйнае пасведчанне. Тым больш не перайшоў ён на паслугі рэжыму.

З тых, хто называе сябе сацыял-дэмакратамі, левацэнтрыстамі, у друку (на старонках «Нашай Нівы») супраць новай нормы працоўнага права першы выступіў Леанід Гаравы.

Нядаўна самы галоўны ў Беларусі заявіў, што дэмакратычную апазіцыю не ўбачыш і праз мікраскоп. Нічога новага ён не прыдумаў. Бо ўжо каторы месяц у электронных і друкаваных СМІ з вядома чыёй падачы пра слабасць дэмакратычнай апазіцыі лялякае гэтак званая «экспертная супольнасць» — розныя журналісты і палітолагі. Але якраз прыклад Леаніда Гаравога абвяргае іх разважанні. Леанід Гаравы — адзін з паспяховых мясцовых дзеячаў дэмакратычнай апазіцыі. Дзеячаў, якія маюць у сваіх гарадах і раёнах немалы аўтарытэт. Як і Ірыну Вештард, Міхася Варанца, Міхася Гіля, Віктара Ярашука, грамадзяне выбіралі яго дэпутатам мясцовага Савета. І, я ўпэўнены, выбралі б яшчэ, калі б улада не дзейнічала напралом, парушаючы ёю ж пісаныя законы. Леаніда Гаравога, дэпутата Гарадоцкага раённага Савета, за яго актыўную грамадзянскую пазіцыю насуперак усім законам не толькі звольнілі з пасады дырэктара школы. Яго, як і Ірыну Вештард, і Міхася Варанца, і Міхася Гіля, і Віктара Ярашука, пазбавілі права на працу.

...Збіраўся я паехаць у Гарадок, каб павіншаваць Леаніда з яго юбілеем асабіста. Не толькі яго, але й ягоную жонку Тацяну і ягоную маці, таксама таварышаў па партыі. Але, як вядома, чалавек плануе, а Бог смяецца. Таму пасылаю яму віншаванне па электроннай пошце. Да віншавання я далучаю самыя шчырыя пажаданні. Думаю, лішне казаць, што я жадаю Леаніду Гаравому моцнага здароўя, так патрэбнай усім нам моцы духу і ўпэўненасці, што ідэалы сацыял-дэмакратыі — ідэалы свабоды, справядлівасці і салідарнасці — пераможуць

**Анатоль Сідарэвіч**




## Песня пра Гомель

Прыкра чуць песню пра тое, што «Гомель — это маленький Париж».

Шмат хто з гамельчукоў ні разу ў жыцці не збочыў з любых бульвараў у самабытныя вулкі, дзе лёгка заблукаць паміж дасавецкіх асабнякоў з бярвення і прысадзістых дамкоў, шматлікіх урвішчаў, спускаў, лесвіц. Затое французы, чэхі, шатландцы з гарадоў-пабрацімаў сузіраюць, нібы цуд, прыкметна састарэлыя, але маляўнічыя драўляныя будынкі.

Не хачу прыпадабняцца да грыбніка і рыбалова з байкі Крапівы, але парыжане нават марыць не могуць, каб за кіламетр ад плошчы дэ Голя ўбачыць буслянку, як у нашым Палявым завулку, што за некалькі хвілінаў хады ад цэнтральнай плошчы Гомеля.

Мясцовы каларыт у нашым горадзе нярэдка мае гратэскавыя рысы: з аднаго краю гістарычнага яра Гамяюк ля палацавай вежы плаваюць лебедзі, а з другога — у завулку Спартака — паміж дашчанікамі мітусяцца куры; са счарнелай прыбіральні можна назіраць за тры сотні метраў вежавых курантаў.

Гэта не той вясковы каларыт, што пракідаецца ў Парыжы паводле задумы ландшафтных архітэктараў, але і не вёска, бо Гомель і Парыж (як асобны горад) роўныя па плошчы.

Можа, фасад кінатэатру Калініна і нагадвае Парыжскі музычны тэатр, а шкляныя піраміды каля універмагу «Гомель» падобныя да парыжскіх пратэатыпаў, але ўсё гэта ёсць і ў Кіеве. А калі Кіеў — сярэдні Парыж, дык гэта ўжо абясцэньванне метафары.

Абясцэньванне, якое пачалося так даўно, што яшчэ ў 1900 годзе гісторык Леў Вінаградаў у кнізе «Гомель. Прошлое і настоящее» назваў комін былой цукроварні «Эйфелева труба».

Зразумела, песня — не падручнік геаграфіі, і нават добра, калі творчыя людзі развенчваюць стэрэатыпы, быццам Беларусь — скрозь бульбянішча. Але калі да метафарычных унутрыгарадскіх назваў: Каўказ, Амерыка, Азія, — што існуюць у Гомелі здавён, гамельчукі дадаюць «гомельскі Крашчацік», «гомельскую Рублёўку», а ўсё разам гэта «маленькі Парыж», прыгадваюцца Багушэвічавы словы: «Дзе ж Беларусь?»

**Сяргей Баранаў, Гомель**

## Наркот

У аптэцы ў самым цэнтры сталіцы, на вуліцы Захарава, наркаман у стане ломкі спрабаваў вымаліць у правізарак жаданыя таблеткі — упрошваў іх дадаць 5000 рублёў, якіх яму бракавала, пад любы заклад. Тыцкаў ім свой мабільны тэлефон як заклад. Яны грэбліва ад яго адбіваліся і называлі «наркотам». Аж трэсла хлопца, зусім маладога. Урэшце ён выскачыў на вуліцу, яго аж круціла. А я падумала: гаспадзе, што будзе з нашай краінай, з нашым чалавецтвам, з маімі дзецьмі ў такім свеце?

> Наркаман у стане ломкі спрабаваў вымаліць у аптэцы жаданыя таблеткі.

**Ніна Сачык, Мінск**

## З лініі Сталіна

Мы з акопаў не выйшлі —
Мы на лініі Сталіна.
У абозе ўсе дыхлі
Ў бок усходу пастаўлены.

Коні зніклі ў каўбасах
Дзвюх сталіцаў імперыі.
Чуць чутно: «Бела Раша...»
Ў час бульбянай містэрыі.

Ў выскалянскія шоў
Перайначаны святы.
Сваю родную мову
Зрэдку чуюць салдаты.

Ад памежнай Гародні
Да грузінскага Горы
Стод у шынэльцы паходнай
Сваю лінію зорыць.

Мы на ўсходзе ў даверы —
Там з нас меншае мыта...
Мы — ландскнэхты імперыі.
Адным словам — найміты.

**Юзік Дзенісюк, в.Абухава (Гарадзенскі раён)**

«НН» з радасцю друкуе ў газеце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаванні. З прычыны вялікага аб’ёму пошты мы не можам пацвярджаць атрыманне Вашых лістоў, не можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам.

**Наш адрас: а/с 537, 220050 Мінск.
e-mail: nn@nn.by.
Факс: (017) 284-73-29**

## Літаратурны конкурс для маладых літаратараў імя Карласа Шэрмана

Беларускі ПЭН-цэнтр абвяшчае творчы конкурс для маладых літаратараў. Ён прымеркаваны да 75-годдзя з дня нараджэння Карласа Шэрмана.



Да ўдзелу запрашаюцца творцы ад 16 да 27 гадоў (на момант абвяшчэння конкурсу). Лаўрэаты конкурсу будуць запрошаныя на літаратурны семінар і майстар-класы ў Мінск. «На конкурс прымаюцца літаратурныя творы тых жанраў, якімі быў слаўны Карлас Шэрман, а менавіта вершы, эсэ, мастацкія пераклады, — кажа куратар конкурсу і старшыня Беларускага ПЭН-цэнтру Андрэй Хадановіч. — Таксама, у сувязі з тым, што сёлета мы адзначаем 200-гадовы юбілей Эдгара Алана По, для маладых перакладчыкаў уведзеная спецыяльная намінацыя «пераклад аднаго твору Э.А.По».

Да разгляду будуць прымацца творы, дасланыя (паводле даты на паштовым штэмпелі або даты адпраўкі электроннага ліста) не пазней за 20 сакавіка 2009 г. Падвядзенне вынікаў першага туру адбудзецца 20 красавіка.

**Калі ласка, паведамляйце сваё прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас, кантактныя тэлефоны.**

Творы можна дасылаць на адрас: e-mail: pen@vessobel.by (з пазнакай «Літаратурны конкурс»). Паштовы адрас: 220050, а/с 218, Мінск, РГА «Беларускі ПЭН-цэнтр». Даведкі праз электронную пошту ці тэлефон (017) 284-73-29.

# Радзівіл Пане Каханку

27 лютага 1734 года ў Нясвіжы нарадзіўся Караль Станіслаў Радзівіл — самы эксцэнтрычны персанаж беларускай гісторыі, які ўвайшоў у яе пад мянушкай «Пане Каханку». Піша **Алег Дзярновіч**.



МАЛЮНАК СЯРГЕЯ ХАРЭЎСКАГА

Гэтую мянушку Караль Станіслаў атрымаў праз сваё ўлюбёнае выслоўе. Жорсткі да падуладных, ён добразычліва ставіўся да шляхты, ужываючы ў дачыненні да кожнага яе прадстаўніка нязменны зварот «Пане Каханку», ды быў папулярны ў яе асяроддзі. Нашы палітычныя, а можа, і маральныя крытэрыі ў аповедзе пра той час напэўна не спрацуюць. Як адзначаў вядомы літаратар XIX ст. Юзаф Крашэўскі ў аповесці пра Пане Каханку «Паперы Глінкі», у той час «было на што паглядзець і чаму падзівіцца, бо тады сіла і моц ішлі на пару з выдумкай; тады чыніліся такія рэчы і дзеі, якім цяпер проста цяжка даць веры».

### Час шызафрэнічнае палітыкі

Палітыкі Рэчы Паспалітай у XVIII ст. былі ўжо не ў стане вырашаць унутраныя палітычныя супярэчнасці без замежнага ўмяшання. Радзівіл выступіў супраць партыі Чартарыйскіх, якіх падтрымала Расія пасля смерці караля Аўгуста III у 1763 г. Даведаўшыся, што Генеральная канфедэрацыя шляхты ВКЛ разам з расійскімі войскамі хочуць заняць Нясвіж, ён рушыў да свайго радавога замка, але быў разбіты расійцамі пад Слонімам.

Пане Каханку хаваўся ў Малдове, Вугоршчыне, Саксоніі. Тады Радзівіл звярнуўся да Кацярыны II з просьбай узяць яго пад сваю пратэкцыю і вярнуць маёнткі, узамен абяцаючы падтрымаць прапанаваную ёй кандыдатуру на трон Рэчы Паспалітай. А ўлетку 1768 г. Пане Каханку ўжо далучыўся да Барскай канфедэрацыі, якая выступіла супраць караля і расійскага ўплыву. Калі расійскія войскі з баямі ўзялі Нясвіж і Слуцк, Радзівіл выехаў гэтым разам у Прусію. Да 1777 г. ён знаходзіўся на эміграцыі ў Вугоршчыне, Турцыі, Чэхіі, Нямеччыне, Францыі, Венецыі.

Каб адцягнуць Радзівіла ад апазіцыі, расійская дыпламатыя зноў прапанавала яму пратэкцыю ды вяртанне маёнткаў. Пане Каханку прыехаў на Радзіму і замірыўся з каралём.

У канцы 1780-х гадоў ён зноў зблізіўся з антыкаралеўскай апазіцыяй, сфармаваў полк, які перадаў у склад войска Вялікага Княства. Далейшых жа падзеяў Радзівіл ужо не пабачыў, бо памёр 21 лістапада 1790 г.

### Ліцвінскі Мюнхгаўзэн

Але легендаю Пане Каханку зрабіла нават не бурлівае палітычнае жыццё, а ягоныя неверагодныя байкі і экстравагантныя ўчынкі. Пане Каханку любіў апавядаць пра тое, як штурмаваў іспанскую Сарагосу. З ягоных словаў, артылерыя фартэцыі вяла ўраганны агонь, аднак князь здолеў на сваім кані Каштанцы прарвацца скрозь град ядраў і карцечы і ўскочыць на вал. І тут ён заўважыў, што сядзіць на адной палове каня. Другую адарвала ядром.

Неяк жа ўлетку Караль Станіслаў схацеў пакатацца на санях. Дзеля гэтага дзядзінец Нясвіжскага замку быў пасыпаны соллю (у іншых версіях аповеду – цукрам), а таксама запрэжаны сані-кулігі.

Адной з улюбёных забаваў князя была наступная: плаціў вяскоўцам, каб залазілі на дрэвы і кувалі. Тады князь браў зброю і страляў ім у «пятую кропку» перцам.

### На дарозе да Менску

Свой жа статус першага магната Рэчы Паспалітай Радзівіл імкнуўся публічна падкрэсліваць пры любой нагодзе. Вось як выглядаў, паводле мемуарыста Марціна Матушэвіча, выезд маршалка трыбунальскага Караля Станіслава ў Менск на сесію Галоўнага Літоўскага Трыбунала: у аршаку (картэжы) ішло «дзвесце драгоній яго людзей абраных, ішла харугва янычарская сто чалавек, таксама прыдворных. Апроч ста чалавек пяхоты венгерскай трыбунальскай насустрач князю на паўмілі выехала цэлае ваяводства Менскае».

### Прыяцель шляхты

Безумоўна, часткаю палітычнай гульні Караля Станіслава было ягонае падкрэсліванне ўласнай блізкасці да шляхты, тым больш што ўласная натура Радзівіла спрыяла панібрацтву.

Мемуарысты апісваюць наступны выпадак, калі «князь быў у гуморы». Тады «ўраднікі і шляхта, магнаты і засцянкоўцы былі брат за брата. Князь, спаткаўшы нейкага шляхціча ў абадранай шапцы, садраў яе з яго, паклаў на сваю галаву, і аддаў яму сваю аксамітную». Як па знаку ўсе пачалі мяняцца шапкамі ды піць». «Потым князь, добра п'яны, пачаў распранацца, лаючыся на шляхту ад добрага сэрца. І так аднаму даў свой пас, кажучы: дару табе... другому кунтуш: маеш... гэтаму дыямантавую запінку: трымай... а іншаму жупан: вазьмі... Так ён застаўся ў малінавых шараварах і ў кашулі... і так узлез на воз, на якім была бочка, поўная віна». Пане Каханку сядзеў на бочцы, а воз шляхта цягнула па вулках Навагрудка.

### «Чорная легенда»

Побач жа з вобразам Пане Каханку як ліцвінскага Мюнхгаўзэна існавала таксама «чорная легенда» Радзівіла. Даследчыкі пішуць, што п'янства выклікала ў ім агрэсіўнасць, лютасць ды ігнараванне звычаёвых нормаў. Тагачасныя мемуарысты абвінавачвалі князя ў эксгібіцыянізме.

Паводле гісторыка і паэта Юліяна Нямцэвіча, Караль Станіслаў не меў іншых пакаёвых распранальнікаў, «як чатырох маладых, свежых, румяных, тоўстых дзевак». Пісьменнік XIX ст. Генрых Жавускі пазней дадаваў, што пасля гулянак Радзівіл распранаўся дагала на вачах у людзей ды казаў паліваць яго вадой. Жавускі таксама сцвярджаў, што Пане Каханку публічна ананіраваў у часе банкетаў, пэцкаўся ды загадваў «задаваць агню на пахаванні Радзівіла».

І хоць чалавек позняга Барока вельмі часта ігнараваў публічныя нормы, але немагчыма не звярнуць увагі на тое, што ў шматлікіх дэвіяцыях і грамадскіх парушэннях Пане Каханку абвінавачвалі ягоныя палітычныя ворагі ці пазнейшыя аўтары, для якіх гэты прадстаўнік дому Радзівілаў увасабляў увесь занепад алігархіі, якую трэба было зацугляць. Каб пакінуць у мінулым сармацкі лад шляхты, трэба было развянчаць ягонага героя.

Караль Станіслаў быў найзаможнейшым магнатам Рэчы Паспалітай і адным з найбагацейшых еўрапейскіх арыстакратаў. Яго маёмасць ахоплівала 16 гарадоў і 683 вёскі, а вакол яго самога складалася шмат легендаў. З аднаго боку, Пане Каханку выяўляўся як адзін з найбольшых п'яніцаў і гулякаў Саскай эпохі, з іншага — як прыклад шляхетнасці, самарыцянства і патрыятызму.

Неверагодна багаты і ўплывовы, ён здабыў сабе сярод шляхты велізарную папулярнасць дзякуючы шчодрасці, сармацкім звычаям, схільнасці да бясед і жартаў. Адначасова быў вядомы сваімі дзікімі выбрыкамі і раздражнёнасцю.

# Сын Якуба Коласа: «Трэба адмяніць ганебны закон аб дзвюх мовах»

21 лютага адзначаецца Дзень роднай мовы. Уведзены з ініцыятывы ЮНЭСКА, ён святкуецца штогод у кожнай краіне свету. Асаблівую ўвагу яму надзяляюць у краінах, дзе існуе моўнае нераўнапраўе.

Зразумела, што ў Беларусі амаль бессэнсоўна чакаць нейкіх пераменаў і ініцыятываў з боку дзяржавы ў такі дзень. Тым не менш, на дзіва, прысвечаны падзеі круглы стол у прэс-цэнтры Дома прэсы не аказаўся маналогам чыноўнікаў наконт колькасці паспяхова зладжаных дзяржаўных мерапрыемстваў.

Агульная інтанацыя выступленняў — маўляў, «мы стараемся і ў нас усё больш-менш добра. Не трэба рабіць рэзкіх рухаў». Напрыклад, дарадца Міністра адукацыі па сувязях са СМІ і грамадскасцю Віктар Іўчанкаў заявіў, што кіраўніка, які абвесціць прымусовую беларусізацыю, на наступны ж дзень «вынесуць з любога пакоя. Такое ўжо было. Наша грамадства яго вынесла, і цяпер ён у глыбокай-глыбокай апазіцыі».

Яму апаніраваў сын Якуба Коласа



Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны ладзіць ужо другую Агульнанацыянальную дыктоўку, што мае адбыцца па ўсёй Беларусі ў тры этапы: 21 лютага, 15 і 25 сакавіка 2009 года. 21 лютага дыктоўку можна напісаць на сядзібе таварыства (Румянцава, 13) а 11 і а 12 гадзінах. На сайце ТБМ tbm.org.by пададзены тэкст дыктоўкі.

Міхась Міцкевіч. У сваім выступе доктар тэхнічных навук заявіў: «Калі мова гіне, то гіне і нацыя. Народ страчвае сваю мову, ён ператвараецца ў гістарычнае смецце. Ідзе найстрашнейшы націск з боку расійскага тэлебачання і расійскіх ідэолагаў. Першае, што трэба рабіць, — адмяніць ганебны закон аб дзвюх мовах. Маскіраваліся, што ўсё будзе ў парадку, будзе і тая мова ўжывацца, і тая, а што атрымалася? Па сутнасці, калі чыноўнік не ведае як адной, так і другой мовы, ён не мае права займаць пасаду. Яго гнаць трэба! Гэта элементарная логіка».

Прывёўшы ў прыклад суседнюю Украіну, навуковец прапанаваў перавесці тэлебачанне на беларускую мову. Таксама ў прапановах Міхася Міцкевіча — павелічэнне колькасці беларускіх школ і класаў ды перайменаванне вуліцаў.

Агульныя ж высновы круглага стала зваліся да ўхвалення існавання беларускамоўнага інтэрнэту і згоды ўдзельнікаў наконт неабходнасці пашырэння ўжытку беларускай мовы.

**Ягор Марціновіч**

КАЛЯНДАР

# Сакавік

**2** — Пачатак Вялікага паста ў праваслаўных, які працягнецца 40 дзён.

**3** — Міжнародны дзень пісьменніка (заснаваны міжнародным ПЭН-Цэнтрам у 1986 г.)

**4** — Дзень святога Казіміра ў каталікоў. У гэты дзень памёр сын вялікага князя Казіміра Ягайлавіча Казімір Казіміравіч, прызнаны пазней святым. Свята літоўцаў Казюкас (бел. Казюк) — у яго гонар.

**8** — Дзень жанчын.

**11** — Свята-карнавал Пурым у юдэяў.

**17** — Дзень Святога Патрыка ў ірландцаў.

**20** — Дзень нараджэння прарока Мухамеда.

**25** — Дзень Волі. У гэты дзень была абвешчаная незалежнасць Беларускай Народнай Рэспублікі.

**25** — Звеставанне ў каталікоў.

СЦІСЛА

### Выстава Заборава ў Мінску

Міністэрства замежных справаў сумесна з Мастацкім музеем плануюць правесці ў Мінску выставу Барыса Заборава. Пра гэта паведаміў міністр Сяргей Мартынаў у аўторак на афіцыйнай цырымоніі перадачы карціны Барыса Заборава «Гумно» музею. Наш зямляк Барыс Забораў эміграваў яшчэ ў савецкі час і жыве ў Парыжы. Ён асабіста прыехаў у Мінск на цырымонію. Гэта яго трэці прыезд у Беларусь за 28 гадоў жыцця ў Францыі. Ён адзіны з нешматлікіх сучасных творцаў, карціну якога нядаўна набыла славутая фларэнтыйская галерэя Уфіцы.

### Праваслаўны фэст у Горадні

Ён называецца «Каложскі Дабравест» і сабраў 40 царкоўных і свецкіх хораў з Беларусі, Украіны, Расіі, Польшчы і Літвы. Урачыстасць адкрыў хор гарадзенскай епархіі малітвай «Ойча наш». Гэта была адна з нешматлікіх песняў па-беларуску, што прагучаць на фестывалі.

### Завальнюк выдаў уласную паэму

Яна называецца «Так хацеў Бог!» і прысвечана 100-годдзю Чырвонага касцёла, заснаванага ў 1910 годзе, і памяці яго фундатара Эдварда Вайніловіча. Паэма напісаная белым вершам.

### Фільм да 600-годдзя Грунвальду

Белтэлерадыёкампанія пачала вытворчасць цыклу перадачаў, прысвечанага юбілею перамогі беларусаў у складзе Вялікага Княства Літоўскага ў Грунвальдскай бітве.

**МБ; Хрысціна Марчук, Горадня**

# Нямецкая рака Нёман

Немцы цікавяцца Беларуссю. І, у тым ліку дзякуючы кіраўніку беларускага МЗС, большасць немцаў ужо старанна вымаўляюць Belarus замест звыклага ім Weissrusland. Некаторыя з нямецкіх гісторыкаў і палітолагаў у сваіх даследаваннях пераходзяць з агульнага (Лукашэнка ды Чарнобыль) плану і пачынаюць глыбей займацца адметнымі праблемамі («НН» ужо пісала пра Фелікса Акермана, гісторыка, закаханага ў Горадню). І яшчэ знак: звычайныя турысцкія дапаможнікі пра Беларусь вычарпалі сваё, і нямецкаму чытачу хочацца большага.

Нямецкі пісьменнік і вандроўнік Увэ Рада найперш цікавіцца рэкамі Еўропы. У супрацоўніцтве з фатографам Інкай Шванд ён напісаў кнігу вандроўных нататак «Одэр. Біяграфія адной ракі». Цяпер на замову нямецкага выдавецтва Siedler збірае матэрыял для падарожнай кніжкі з працоўнай назвай «Нёман. Рака ў цэнтры Еўропы».

**«НН»: Увэ, вось чаму не Дняпро?**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Увэ Рада:** Хто ў Германіі цікавіцца Дняпром?! Мы ж працуем для нямецкага чытача, а ў працівагу Дняпру, Нёман — для немца цікава. Нёман цячэ па тэрыторыі колішняй Усходняй Прусіі (цяпер Калінінградская вобласць РФ. — Кар.), і засталіся немцы, якія жылі на яго берагах, для іх Нёман — частка жыцця. У гістарычным гімне «Дойчлянд убэр алес» былі радкі «Ад Маасу да Мемеля».

**«НН»: Нёман — нямецкая рака?**

**Увэ Рада:** Нёман, як Міцкевіч, належыць некалькім культурам. Больш за тое, на грунце цікаўнасці да адной ракі нараджаецца пачуццё лучнасці розных народаў.

Кніжны рынак Германіі перажывае бум — за год выходзяць на рынак 100 000 найменняў. Ляйпцыгскі і Франкфурцкі кніжныя кірмашы — найбуйнейшыя ў свеце.

У Германіі існуе стала высокі попыт на турыстычныя дапаможнікі і падарожныя кніжкі.

Апавядаючы пра вылучаныя на праект выдавецтвам 1000 еўра і выдаткаваныя імі з уласнай кішэні дадатковыя тры тысячы, Увэ і Інка менш за ўсё выдаюць на разважлівых бізнэсоўцаў, якія адно мараць на кнізе зарабіць. Яны хутчэй зачараваныя падарожжамі.

Дадамо толькі, што ў Вялікай Брытаніі ўжо колькі гадоў з поспехам перавыдаецца «Трое ў лодцы, не ўлічваючы сабакі» ў форме турысцкага дапаможніка, дзе класічны тэкст Джэрома К. Джэрома аздоблены інфармацыяй пра калябрэжныя гатэлі і здымкамі маляўнічых лукаў і прыгожых мясцінаў Тэмзы.

Выхад кнігі пра Нёман запланаваны на 2010 год.

**Павал Касцюкевіч**

### Вялікі Нёман

Пакуль немцы асвойваюць нёманскія хвалі, мінскае выдавецтва «Рыфтур» ужо здзейсніла сваё воднае падарожжа і нават выдала фотасправаздачу.

Беларуска-літоўскі экіпаж на лодках з ветразямі прайшоў па Нёмане ад сядзібы Навасёлкі ў Мастоўскім раёне да літоўскіх Друскенікаў. Маляўнічыя краявіды Горадні, Свяцку і Друскенікаў на старонках альбому чаргуюцца са здымкамі стракатых народных фэстаў і нават з «выпадкова завіталым» павесяліць вяслярную грамаду бардам Віктарам Шалкевічам. У альбоме хіба крыху бракуе тэксту, але на тое яна і фотасправаздача.

Арганізатар праекту «Вялікі Нёман/Didisis Nemunas», чалавек з самым рэкаходным прозвішчам у галіне кнігавыдавецтва Сяргей Плыткевіч кажа: «Такія праекты, як «Вялікі Нёман» — ідэальная сітуацыя для краязнаўцы: праект дазваляе займацца ўлюбёнай справай — вывучэннем сваёй краіны і ў адначас працаваць, атрымліваць грошы».

**Лявон К.**




**Вялікі Нёман/Didisis Nemunas. Хроніка воднага падарожжа па Нёмане з Беларусі ў Літву.** — Мінск: Рыфтур. 2007. — 55 с. 500 ас.

# Крызіс? Які крызіс?

Што будуецца ў Мінску і што перабудоўваецца.



На дамавую царкву Мінскай духоўнай акадэміі, відаць, збіраюцца ставіць купал. Будзе не цыбуліна, але шалом.






У першым будынку «архітэктурнай фантазіі» архітэктара Дулевіча на Нямізе ўжо кроквы стаяць. Працуюць нават у нядзелі і, як бачыце, ужо прапануюць набыць плошчы.



Сірыйская кампанія «Кравіра», якая акрамя ўсяго іншага кіруе бізнэс-цэнтрам «Саака» па вуліцы Цэткін, надумалася побач будаваць нешта грандыёзнае.



У Верхнім горадзе адбудаваны адзін з новых флігеляў сядзібы Ваньковіча. Калі не лічыць неаўтэнтычнай металадахоўкі, выйшла даволі няблага. Дарэчы, у найбліжэйшых планах «Мінскай спадчыны» — узяцца за суседнія два дамы.




Паводле dariuss.livejournal.com

# Ляпіс Трубяцкой




## КАНЦЭРТЫ

**Ірландскія танцы**

**27 лютага ў клубе «Рэактар» (В.Харужай, 29)** — канцэрт-вечарына «Ірландскія танцы» з удзелам гуртоў **«Рагнеда»** і **«Бассданс»**. **Пачатак а 20-й**

**Neuro Dubel**

**1 сакавіка ў «Гудвіне»** — канцэрт **Neuro Dubel**, **ZigZag**, **Blagi mat** ды іншых. **Пачатак а 18-й**

**Табе адной**

**8 сакавіка ў вялікай залі канцэртнай залі «Мінск» Зміцер Вайцюшкевіч** і **WZ-Orkiestra** выступяць з вялікім канцэртам «Табе адной». Удзел у канцэрце таксама возьмуць паэты Уладзімір Някляеў, Генадзь Бураўкін, Леанід Дранько-Майсюк. Пачатак а 19-й

**Naka і Pomidor/off**

**8 сакавіка ў «Гудвіне» (пр.Незалежнасці, 19)** — канцэрт гуртоў **Naka** і **Pomidor/off**. **Пачатак а 19-й**

**Рокаш**

**27 лютага ў галерэі «Універсітэт культуры» (Кастрычніцкая пл., 1)** — канцэрт гуртоў **«Рокаш»**, **«Like a gossamer»**. **Пачатак а 17-й**

## ІМПРЭЗЫ

**Начная чытанка**

Прэзентацыі мультымедыйнага дыску «Начная чытанка» радыё «Свабода» пройдуць **2, 3 і 4 сакавіка ў Менску, у фальварку «Добрыя мыслі» (Магілёўская, 12), 19.00. 5 сакавіка — у Магілёве, у цэнтры «Кола сяброў» (зав.Чкалава 16), 18.30.** Сярод аўтараў: Уладзімір Арлоў, Наталка Бабіна, Генадзь Бураўкін, Алег Мінкін, Людміла Рублеўская, Васіль Сёмуха. Уваход вольны. Кожны наведнік атрымае бясплатны дыск.

**Вершы і зоркі**

**27 лютага ў бібліятэцы імя Цёткі (Талбухіна, 12а)** — прэзентацыя кнігі Міколы Кандратава «Вершы і зоркі». **Пачатак а 18-й**

**Майстар-клас па вышыўцы**

**25 лютага ў галерэі «Універсітэт культуры» (Кастрычніцкая пл., 1)** — майстар-клас па традыцыйнай вышыўцы. **Пачатак а 17-й**

## ВЫСТАВЫ

**Партрэт Вясны ў жалезнай абламоўцы**

**У Гістарычным музеі (Маркса, 12) да 31 сакавіка** працуе міжнародная выстава «Партрэт Вясны ў жалезнай абламоўцы», арганізаваная беларускай Гільдыяй кавалёў.

**Вясельная выстава**

**Да 7 сакавіка ў Маладзечне** працуе «Вясельная выстава». У экспазіцыі скарыстаныя рэчы з фонду абласнога краязнаўчага музея. У дзень закрыцця выставы плануецца выступ фальклорнага гурту «Гуда».

**Abstract-2009**

**У Палацы мастацтва (Казлова, 3) да 15 сакавіка** працуе выстава «Abstract-2009», прысвечаная 90-годдзю Віцебскай мастацкай школы.

**Бліжэй толькі неба**

**У галерэі візуальных мастацтваў NOVA (Веры Харужай, 16) да 22 сакавіка** працуе фотавыстава Аляксея Андрэева «Бліжэй толькі неба», прысвечаная Тыбету.

**Алтарны жывапіс XVIII — XIX стагоддзяў**

**23 лютага ў мастацкім музеі** пачынаецца выстава «Алтарны жывапіс XVIII—XIX ст.», на якой можна будзе ўбачыць 33 творы рэлігійнага жывапісу з фондаў музея, многія з якіх экспануюцца ўпершыню.

**Беларусь на літаграфіях Орды**

**У гомельскім палацы Румянцавых-Паскевічаў да 29 сакавіка** працуе выстава «Беларусь на літаграфіях Напалеона Орды».

**Радзівілаўская мапа ў Гістарычным музеі**

**У Музеі гісторыі і культуры (Маркса, 12) да 1 сакавіка** працуе выстава «Дэманструецца ўпершыню», на якой паказаныя экспанаты з новых паступленняў у фонд музея: радзівілаўская мапа пачатку XVII стагоддзя, арнат з устаўкамі са слуцкага поясу XVIII ст., археалагічныя экспанаты, калекцыя нумізматыкі і сфрагістыкі…

## ТЭАТРЫ

**26 лютага**

**Тэатр беларускай драматургіі** — «Дзённік паэта» (прэм'ера)
**Купалаўскі тэатр** — «Пінская шляхта»
**Тэатр лялек** — «Балада пра Белую Вішню»
**Музычны тэатр** — «Юнона і Авось»
**Тэатр імя Горкага** — «Анджэла і іншыя»

**27 лютага**

**Купалаўскі тэатр** — «Таполевая завея»
**Купалаўскі тэатр** *(малая сцэна)* — «Маці»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Нязваны госць»
**Тэатр лялек** — «Прыгоды алавяннага жаўнерыка, пастушкі і камінара»
**Опера** — «Сельскі гонар»
**Тэатр імя Горкага** — «Перад заходам сонца»
**Музычны тэатр** — «Юнона і Авось»

**28 лютага**

**Купалаўскі тэатр** — «Вечар»
**Купалаўскі тэатр** *(малая сцэна)* — «Дзікае паляванне караля Стаха»
**Тэатр лялек** — «Жудасны спадар Ау»
**Балет** — «Легенда пра Уленшпігеля»
**Тэатр імя Горкага** — «Васа»

**1 сакавіка**

**Купалаўскі тэатр** — «Паўлінка»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Сталіца Эраўнд»

**2 сакавіка**

**Купалаўскі тэатр** — «Ідылія»

**3 сакавіка**

**Купалаўскі тэатр** — «Сублімацыя кахання»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Неба ў дыяментах»
**Тэатр лялек** — «Пінокіё»
**Балет** — «Жызэль»

**4 сакавіка**

**Купалаўскі тэатр** — «Слуга двух гаспадароў»
**Купалаўскі тэатр** *(малая сцэна)* — «Адчыніце кантралёру!»
**Тэатр лялек** — «Пінокіё»

**5 сакавіка**

**Купалаўскі тэатр** — «Вечар»
**Купалаўскі тэатр** — «Апельсінавае віно»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Прызнанне»
**Тэатр лялек** — «Сіняя птушка»

**6 сакавіка**

**Купалаўскі тэатр** — «Чайка»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Адэль»

**7 сакавіка**

**Купалаўскі тэатр** — «Сны аб Беларусі»
**Тэатр лялек** — «Васіліса Прыўкрасная»

**8 сакавіка**

**Тэатр лялек** — «Чырвоны каптурок»

## КІНО Ў МІНСКУ

### Праграма ранніх фільмаў Рамана Паланскага

Пры канцы тыдня кінапракат прапануе рарытэты — першыя стужкі слыннага рэжысёра Рамана Паланскага.

Карціна **«Нож у вадзе»** — драма, знятая ў Польшчы ў 1962 годзе. Высокапастаўленая сямейная пара падбірае на дарозе маладога чалавека і забірае з сабой на яхту, каб навучыць розуму. Паміж героямі завязваюцца складаныя стасункі ўлады й рэўнасці. Сціплы чорна-белы фільм выклікаў раздражненне партыйнай эліты, але стужка тычыцца любой улады і любой маладосці.

Фільм **«Агіда»** 1965 года — камерны фільм жахаў з Катрын Дэнёў у галоўнай ролі. Бялявая прыгажуня, якая баіцца мужчынаў, застаецца адна ў кватэры і заглыбляецца ва ўласныя галюцынацыі. Карціна Паланскага (якая выклікала захапленне ў псіхіятраў) — энцыклапедыя кінапрыёмаў. З абмежаваным бюджэтам і на абмежаванай прасторы рэжысёр па-майстэрску стварыў кашмарна-трымценнае відовішча.

Гратэскная драма **«Тупік»** 1966 года — адзін з самых загадкавых і незаўважаных фільмаў Паланскага, хаця сам рэжысёр вельмі цэніць яго. Два бандыты трапляюць у палац на марскім беразе, дзе жывуць новаабвенчаныя дзівакі. Без заблытаных псіхалагічных гульняў не абысціся.

Асобным сеансам дэманструюцца кароткаметражныя стужкі рэжысёра, якія ён зняў падчас навучання ў Лодзі. Сюррэалістычныя **«Тоўсты і тонкі»**, **«Двое і шафа»**, **«Забойства»**, **«Выскал»**, **«Лямпа»**, **«Сысуны»** — дэманструюць першыя крокі прызнанага творцы.

**Андрэй Расінскі**

Паказы пройдуць **у Доме кіно (Талбухіна, 18) 26 лютага**. **Пачатак а 19-й**

# «Белсат»: тэлепраграма на 2—8 сакавіка
# «Белсат» — гэта незалежны беларускі спадарожнікавы тэлеканал

## 2 сакавіка, панядзелак

**18.00** Аб’ектыў (навіны, 1 выпуск)
**18.10** «Ранча», серыял, 15 серыя
**19.00** «1945: год, які змяніў свет», дак. фільм, рэж. Гэбі Кент, 2005 г., Вялікая Брытанія, ч. 2



**20.05** Тыдзень з радыё «Свабода»
**20.35** Еўразвяз без сакрэтаў
*Тэлецыкл расказвае беларускаму гледачу пра тое, як функцыянуе Еўрапейскі Звяз, што стаіць у цэнтры яго палітыкі ў дачыненні дзяржаваў былога СССР, патлумачыць стратэгію ЕЗ у галіне эканомікі ды палітыкі добрасуседства.*
*Працэс еўрапейскай інтэграцыі лучыць у сабе шэраг разнастайных дзеянняў, галоўным вынікам якіх мае стаць супольнасць людзей, якая абапіраецца на гарманічнае спалучэнне разнастайнасці і агульнасці культурнай спадчыны Еўропы, на эканамічную супрацу, а таксама на ўзнікненне адпаведных агульнаеўрапейскіх інстытутаў і арганізацыяў.*
*Праграма падрыхтаваная на падставе матэрыялаў, прапанаваных Еўрапейскаю Камісіяй.*
**21.00** Аб’ектыў (навіны, галоўны выпуск)
**21.20** «Без рэтушы»: «Песня на два галасы», дак. фільм, рэж. Юры Каліна, 2009 г., Польшча
*У пачатку лютага ў Беластоку ўжо 16-ы раз адбыўся фестываль «Беларуская песня», дзе выконвалася традыцыйная і папулярная, фальклорная і эстрадная музыка. Асноўная колькасць удзельнікаў традыцыйна прыбыла з Бельску, Гайнаўкі ды іх ваколіцаў. Здымачная група зазірнула не толькі на сам канцэрт, але і паказала, як выканаўцы рыхтуюцца да выступаў, рэпетуюць, пра што размаўляюць. Удзельнікі фестывалю расказваюць, якое значэнне мае імпрэза для саміх выканаўцаў і гледачоў, што дае беларуская песня Падляшшу.*
**21.40** «Гэтыя і тыя», маст. фільм, рэж. Клод Лелюш, 1981 г., Францыя, ч. 1. У ролях: Рабэр Асэйн, Джэралдын Чаплін, Даніэль Альбрыхскі.
**23.15** «Элі Макбіл», тэлесерыял: ІІІ сезон, 19 серыя
**00.00** Аб’ектыў (навіны)

## 3 сакавіка, аўторак

**18.00** Аб’ектыў (навіны, 1 выпуск)
**18.10** «Элі Макбіл», тэлесерыял: ІІІ сезон, 19 серыя
**18.55** «Норкі», камедыя, рэж. Ян Гржэбэйк, 1998 г., Чэхія
**20.40** Рэальная гаспадарка
*Аналітычная праграма, якая апавядае пра найбольш актуальныя падзеі і тэндэнцыі эканамічнага жыцця Беларусі.*
**21.00** Аб’ектыў (навіны, галоўны выпуск)
**21.15** «Блізкая гісторыя. Іншы погляд»: «ІзГоі», дак. фільм, рэж. Аляксандр Ступнікаў, 2009 г., Беларусь
*Фільм апавядае пра невядомую старонку гісторыі Беларусі — існаванне габрэйскіх партызанскіх атрадаў. Гэта былі адзіныя ў Еўропе ўзброеныя аддзелы габрэяў, якія не толькі змагаліся з немцамі, але і дапамагалі перажыць навалу тым, хто ўцёк з гета і хаваўся па лясах, каб не стацца ахвярай нацыстаў.*
**22.15** Форум: Гендэр з намі! Адносіны полаў як сацыяльная праблема
**23.00** «Элі Макбіл», тэлесерыял: ІІІ сезон, 20 серыя
**23.45** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (гумарыстычная праграма)
**00.00** Аб’ектыў (навіны)

## 4 сакавіка, серада

**18.00** Аб’ектыў (навіны, 1 выпуск)
**18.10** «Элі Макбіл», тэлесерыял: ІІІ сезон, 20 серыя
**18.55** Беларусы ў Польшчы
**19.10** YoLife! (моладзевая праграма)
**19.30** «Ваенны фатограф», дак. фільм, рэж. Хрыстыян Фрай, 2001 г., Швейцарыя



**20.25** Праект «Будучыня»: навукова-папулярны агляд тэлеканалу «Нямецкая хваля»
**21.00** Аб’ектыў (навіны, галоўны выпуск)
**21.15** Рэпартэр (публіцыстычная праграма)
**21.45** «Рок па вакацыях-2008», ч. 2
**22.35** Еўропа сёння: тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»
**23.05** «Мент», дэтэктыўны серыял, 15 серыя
**00.00** Аб’ектыў (навіны)

## 5 сакавіка, чацвер

**18.00** Аб’ектыў (навіны, 1 выпуск)
**18.10** «Мент», дэтэктыўны серыял, 15 серыя
**19.00** Кружэлка (сусветная музыка)
**19.30** «Кароль Уга», дак. фільм, рэж. Франка дэ Пэна, 2007 г., Польшча



**20.40** Кінастужка (агляд кінарынку)
**21.00** Аб’ектыў (навіны, галоўны выпуск)
**21.15** Сальда (эканамічная праграма)
**21.30** На колах: аўтамабільны агляд тэлеканалу «Нямецкая хваля»
**22.00** Госць «Белсату»: Сакрат Яновіч
**22.20** Інтэрнаўты выбіраюць
**23.10** «Мент», дэтэктыўны серыял, 16 серыя
**00.00** Аб’ектыў (навіны)

## 6 сакавіка, пятніца

**18.00** Аб’ектыў (навіны, 1 выпуск)
**18.10** «Мент», дэтэктыўны серыял, 16 серыя
**18.55** Хто ёсць кім? Кастусь Шыдлоўскі
**19.15** Праект «Будучыня»: навукова-папулярны агляд тэлеканалу «Нямецкая хваля»
**19.40** «Невядомая Беларусь»: «Як пушчу стралу», дак. фільм, рэж. Юры Выдронак, 2009 г., Беларусь
**20.10** Кухня (музычная праграма)
**20.40** Паштоўка з Вільні (праграма пра беларусаў у Літве)
**21.00** Аб’ектыў (навіны, галоўны выпуск)
**21.15** Госць «Белсату»: перадача пра надзённыя праблемы Беларусі
**21.35** «Сакавіцкія міндальныя мроі», маст. фільм, рэж. Радаслаў Піваварскі, Ганна Грынашкевіч, Ірэна Кілярска-Кабежэўска, 1989 г., Польшча.
*Фільм пра пакаленне тых, каму сёння за пяцьдзесят, чыя маладосць прыпала на канец 1960-х. Тады юнакі сутыкнуліся з працэсамі, якіх да канца не разумелі: яны даведваліся пра тое, што адныя з іх добрыя палякі, а другія — не, бо яны сіяністы. Пачалася масавая эміграцыя. Марцысь, адзін з герояў фільму, персанаж аўтэнтычны, школьны сябар, не хацеў з’язджаць. Рэжысёр уклаў у гэтую стужку шмат асабістага. Ён аднавіў атмасферу малога мястэчка, падобнага да таго, у якім ён сам выхоўваўся, марыў і жыў праблемамі тагачасных падлеткаў.*






**23.10** «Пітбуль», серыял, 16 серыя
**00.00** Аб’ектыў (навіны)

## 7 сакавіка, субота

**18.00** Аб’ектыў (навіны, 1 выпуск)
**18.10** Тыдзень з радыё «Свабода»
**18.40** Кінастужка (агляд кінарынку)
**19.00** «Беларускі фронт, альбо Размовы пра мову», дак. фільм, рэж. Віктар Корзун, 2007 г., Беларусь
**19.55** На колах: аўтамабільны агляд тэлеканалу «Нямецкая хваля»
**20.20** «Радыёкропка», дак. фільм, 2008 г., Беларусь
**20.30** Падземка (беларускі хіт-парад)
**21.00** Аб’ектыў (навіны, галоўны выпуск)
**21.15** Маю права (праваая праграма)
**21.35** Еўропа сёння: тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»
**22.00** «Імперыя ваўкоў», крымінальны трылер, рэж. Крыс Наон, 2005 г., Францыя. У ролях: Жан Рэно, Лаўра Марантэ.
*Літаратурную аснову стужкі стаўся раман Жана-Крыстофа Гранжэ. Малады паліцыянт Поль расследуе серыю забойстваў дзяўчат у турэцкім квартале Парыжы. Ён звяртаецца па дапамогу да былога паліцыянта Шыфера. Разам яны шукаюць наступную ахвяру і забойцаў, але не ведаюць, што іх саміх пераследуе таемная турэцкая групоўка. Высвятляецца, што маладая жанчына, Ганна, сталася аб’ектам псіхіятрычнага эксперыменту, мэта якога — сцерці памяць пра яе мінулае жыццё і стварыць з яе новую асобу. Менавіта яе шукаюць і паліцыянты, і гангстэры...*
**00.00** Аб’ектыў (навіны)

## 8 сакавіка, нядзеля

**18.00** Прэс-экспрэс (агляд друку)
**18.20** «Ранча», серыял, 16 серыя
**19.10** Наша сцэна: канцэрт дуэту «Гурзуф»
**19.45** Жаўтуха (гумарыстычная праграма)
**20.10** «1945: год, які змяніў свет», дак. фільм, рэж. Гэбі Кент, 2005 г., Вялікая Брытанія, ч. 3
**21.00** Аб’ектыў (вынікі тыдня)
**21.25** Форум: Рэфармаванне ці толькі перафарбоўка фасаду?
*Галоўная палітычная інтрыга апошніх месяцаў у Беларусі — гэта перамовы беларускага ўраду з Еўрапейскім Звязам і звязаныя з гэтым пэўныя праявы адлігі ў палітычным жыцці. Адныя называюць гэтыя перамовы бесперспектыўнымі, другія вераць у лепшае. А трэція не вераць нікому і чакаюць катастрофы, якая зруйнуе існы палітычны лад. Тым больш, што крызіс закрануў і Беларусь.*
*У віленскай студыі дыскутуюць: Яраслаў Раманчук, эканаміст; праф. Андрэй Вардамацкі, дырэктар сацыялагічнага цэнтру «Новак»; Анатоль Лябедзька, старшыня АГП; Жанна Літвіна, старшыня БАЖ; Андрэй Саннікаў, каардынатар грамадзянскай кампаніі «Еўрапейская Беларусь»; Сяргей Калякін, першы сакратар ПКБ; Станіслаў Шушкевіч, старшыня партыі Беларуская сацыял-дэмакратычная грамада; Лявон Баршчэўскі, старшыня Партыі БНФ.*
**22.10** «Гэтыя і тыя», маст. фільм, рэж. Клод Лелюш, 1981 г., Францыя, ч. 2.
*Музычны фільм-эпас. Стужка лічыцца найлепшаю працаю французскага рэжысёра Клода Лелюша. У амерыканскай версіі фільм вядомы пад назваю «Балеро», якая адсылае да аднайменнага музычнага шэдэўру Марыса Равэля, крыніцу аднаго з музычных лейтматываў фільма. У стужцы апавядаецца гісторыі двух пакаленняў сем’яў французскага габрэя — піяніста Сімона Мэера, нямецкага кампазітара Карла Крэмэра, расійскай балерыны Таццяны Ітовіч і амерыканскага дырыжора джазавага аркестра Джэка Глэна. Усе гэтыя сем’і яднае любоў да музыкі і мастацтва ў цэлым, а таксама перажытая ІІ сусветная вайна. Гісторыі чатырох сем’яў з 1930-х да канца 1970-х гг. неаднаразова перакрыжоўваюцца. Прататыпамі шматкаго з персанажаў сталі такія легенды музыкі XX ст., як Эдыт Піяф, Джазэфін Бэйкер, Гэрбэрт фон Караян, Глен Мілер, Рудольф Нурыеў ды інш. Кульмінацыйны пункт у канцы фільму — супольнае выкананне балеро падчас гала-канцэрту, зарганізаванага яшчэ адным з вобразаў-лейтматываў фільму — Міжнародным Чырвоным крыжам.*
**23.45** «Бульбаны», мультсерыял
**00.00** Аб’ектыў (вынікі тыдня)

# Беларус паедзе на «Еўрабачанне» ад Нарвегіі

**Саша Рыбак скарыў край Паўночнага Шляху песняй–казкай «Казка».**

Ад Нарвегіі на «Еўрабачанне» паедзе 22-гадовы хлопец-беларус Аляксандр Рыбак.

Ён прыехаў у Нарвегію разам з бацькамі ў чатыры гады, стаў сур'ёзна займацца музыкай, граць на скрыпцы. Працаваў разам з музыкамі з A-ha, браў удзел у фабрыцы зорак па-нарвежску з песняй уласнага сачынення Foolin. Ён быў узнагароджаны прэстыжнай прэміяй Anders Jahres Culture Prize у 2004 годзе. Цяпер ён таксама грае ў тэатры і здымаецца ў фільме пра цыганаў, што мае выйсці летам.

Аляксандр Рыбак не сваяк беларускага пісьменніка Алеся Рыбака, аўтара хіту «Бывайце здаровы», хоць сын апошняга таксама ў свой час папрасіў палітычнага прытулку ў Нарвегіі (разам са Славамірам Адамовічам).

Нарвежцы выбіраюць кандыдата на «Еўрабачанне» праз ТВ-шоў SMSавым галасаваннем.

Фіналістаў было восем, Рыбак перамог. Больш за 700 000 чалавек аддалі свае галасы за яго. Поп-зорка Тунэ Дамлі Обэргэ заняла другое месца са 120 000 галасоў.

Матывы народнай музыкі, што натхнялі вялікага Грыга, адбіліся і на немудрагелістай песеньцы Рыбака. З прыкольнага: сам Рыбак падобны да мамы, а вось яго тата — чысты ППРБ. Дарэчы, тата — ён кіруе школай ігры на скрыпцы — не толькі не забываецца пра радзіму, але і з гонам расказвае, што піша творы на вершы Багдановіча.

МБ



Сам Аляксандр Рыбак падобны да мамы, а вось ягоны тата — чысты ППРБ.

## ЖАРТЫ

Гутараць два антыкрызісныя мэнэджэры:

**Першы:** «Як толькі пачаў працаваць антыкрызісным мэнэджэрам, дык стаў спаць як дзіця».

**Другі** (здзіўлена)**:** Як так?

**Першы:** А так — штогадзіны прачынаюся і плачу.

* * *

У краме электратавараў.

**Кліент:** Вось скажыце: гэты электрачайнік у вас каштуе 40 тысяч, а той — 60. Якая паміж імі розніца?

**Прадавец:** У 20 тысяч.

* * *

Мужчына, што завітаў у музей, выгукае:

— І гэта вы называеце мастацтвам!?

Музейны работнік:

— Не, гэта мы называем люстэркам.



## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### КВАТЭРА

**Прадам альбо памяняю** на Мінск ці Брэст пяціпакаёвую двухузроўневую кватэру ў пасёлку Мір Баранавіцкага раёну. Т.: (029) 570–80–88

### КНІГІ

**Сябры!** Пабачыў свет новы энцыклапедычны даведнік Леаніда Маракова «Рэпрэсаваныя каталіцкія духоўныя, кансэкраваныя і свецкія асобы Беларусі. 1917—1964», у якім згадана больш за 2500 святароў і каля 900 касцёлаў. Каб набыць гэтае ўнікальнае выданне, вам трэба патэлефанаваць: (029) 753–82–12, (044) 722–07–71

**Куплю** кнігу Юрэвіч Л. «Жыццё пад агнём». Мн., 1999. Пісаць сюды mole–by@yandex.ru

**Прапаную падарункавы камплект** аудыёкніг Арлова: «Адкуль наш Род», «Ордэн Белай мышы», «Сны імператара», «Таямніцы Полацкай гісторыі», «Паўстанцы», кнігі па гісторыі, дашлю спіс прапановаў, ад Вас канверт са зв. адрасам. Т.: (029) 753–91–96, alesknigi@mail.ru, а/с 195, 220030, Мінск

### СЯБРОЎСКІЯ ПАДАРОЖЖЫ

**29 сакавіка запрашаем** у вандроўку «За вольнасць нашу і вашу» па маршруце: Залессе — Смаргонь — Войстам — Солы — Кушляны — Жупраны — Ашмяны. Т: (029) 111–73–32, 262–73–43. Запытаць Антона Астаповіча. astant@tut.by

**1 сакавіка адбудзецца экскурс** па цікавых мясцінах Берасця з гісторыкам ды экскурсаводам Сержуком Быцкевічам. Т.: (029) 761–07–94, (044) 516–15–48 (Кірыла)

**Магілёўскае ТБМ запрашае** ў падарожжа 1 сакавіка: Шклоў — Александрыя — Копысь — Ляўкі. Т.: (029) 245–64–52, (029) 388–35–61 (Алег), (029) 245–64–52, (029) 388–35–61 (Юрась)

## НН запрашае на сталую працу

мэнэджэра па распаўсюдзе з правамі кіроўцы і машынай. Заробак высокі, калектыў беларускі. Прапановы і звесткі пра сябе кіруйце на э–пошту nn@nn.by. Рэкамендацыі і досвед працы вітаюцца, але не канечне, каб яны былі.

**Прыватныя абвесткі ў «НН»** (не больш за 15 словаў) можна падаць бясплатна. Дасылайце поштай (а/с 537, 220050, Мінск) ці праз e–mail (nn@nn.by) або размяшчайце на форуме сайту www.nn.by. Дык скарыстайцеся!


## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

**У Думе і каля Думы.**

Разбіраюць праект закона аб адмене кары смерцю. Ад левых выступае Булат (трудавік, літвін, Сувальскай губ.) Ён кажа, што статыстыка паказвае, што там, дзе кары смерцю няма, зменшаецца і лічба праступкаў, каторыя караюцца смерцю. Правыя кажуць: «Няхай рэвалюцыянеры перастануць забіваць людзей, тады і мы будзем стаяць за адмену кары смерцю». Але ... кара смерцю мусіць быць адмененая яшчэ і таму, што суд — рэч чалавечая і можа ён памыліцца. Не раз пасля расстрэлу суддзі дазнаваліся, што згубілі нявіннага чалавека.

**«Наша Ніва». №8. 1909**

## У Рыё стартаваў карнавал

Сотні тысячаў турыстаў з усяго свету едуць на карнавал у Рыё-дэ-Жанэйра. Усе чакаюць галоўнай падзеі: спаборніцтваў школаў самбы.

Бразільскі карнавал — гэта свята прыгажосці, азарту, танцаў і ... эротыкі. Нездарма Міністэрства аховы здароўя выказвае заклапочанасць усплёскам венерычных захворванняў падчас (ці пасля) карнавалу, а таксама абортаў. Сёлета на барацьбу з «пабочнымі эфектамі» карнавалу раздаюць па ўсёй Бразіліі мільёны бясплатных прэзерватываў.

Карнавал прыцягвае ў Рыё-дэ-Жанэйра мноства злодзеяў. Ужо некалькі дзесяткаў чалавек былі абрабаваныя, а колькіх яшчэ абрабуюць на вуліцах горада.




**Наша Ніва**

незалежная газета

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
шэф–рэдактар — Андрэй Дынько
галоўны рэдактар — Андрэй Генадзевіч Скурко
мастацкі рэдактар — Сяргей Харэўскі
заснавальнік — Мясцовы фонд выдання газеты «Наша Ніва»
выдавец — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Мінск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**


© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.
12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасці за змест рэкламных абвестак. Кошт свабодны. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №581 ад 14 сакавіка 2007 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Мінск, пр. Ракасоўскага, 102–71. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Мінск, код 764.

**Наклад** 5500. **Газета выдаецца 48 разоў на год.**
**Нумар падпісаны ў друк** 23.00 25.02.2009.
**Замова №** 1031.
ISSN 1819-1614
**Рэдакцыйны адрас**: Ракасоўскага, 102–71.
Цана дамоўная.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
9771819161008 09008